

У ПАМЯЦЬ АКАДЭМІКА КАРСКАГА 3


ШТО І ЯК ЕСЦІ, КАБ НЕ ХВАРЭЦЬ 5



13 ЛІСТАПАДА 2019 г. СЕРАДА

№ 215 (29082)

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА


# У НАШАЙ АГУЛЬНАЙ ЕЎРОПЕ

## Візіт найвышэйшага ўзроўню ў Вену абазначыў пазіцыю Беларусі не толькі ў двухбаковых адносінах з Аўстрыяй

**Візіт кіраўніка беларускай дзяржавы ў Аўстрыю яшчэ напярэдадні многія называлі ў пэўным плане гістарычным. Так яно і атрымалася: словы беларускага лідара будуць цытаваць крыніцы ва ўсёй Еўропе, пачнуць працаваць сумесныя прадпрыемствы, сувязі паміж людзьмі стануць мацнейшымі. Візіт нібы і звычайны, ды не зусім шараговы па перадгісторыі і выніках. І гэта было відавочна з самага пачатку.**


Фота БелТА.

Першы напрамак па прылёце — перад усімі афіцыйнымі сустрэчамі, якія былі запланаваныя на наступны дзень, — да помніка савецкім воінам-вызваліцелям у Вене, дзе Аляксандр Лукашэнка ўсклаў вянок. Дыпламатычны свет высока ацаніў сімвалічнасць такога пачатку афіцыйнага візіту. Яшчэ напярэдадні аўстрыйскі бок заявіў, што Прэзідэнта Беларусі чакаюць з адкрытым сэрцам.

Учора Федэральны прэзідэнт Аўстрыі Аляксандр Ван дэр Белен вітаў кіраўніка беларускай дзяржавы ў рэзідэнцыі Федэральнага прэзідэнта ва ўнутраным двары палаца Хофбург. Перагаворам лідараў краін папярэднічала цырымонія афіцыйнай сустрэчы з удзелам ганаровай варты, выкананнем гімнаў дзвюх краін, а таксама прадстаўленне членаў афіцыйных дэлегацый і пратакольная фотаздымка.

Сустрэча прэзідэнтаў прайшла ў вузкім і пашыраным фарматах. Аб яе выніках кіраўнік беларускай дзяржавы разам са сваім аўстрыйскім калегам расказаў прадстаўнікам СМІ. Прэзідэнт Беларусі падзякаваў Аляксандру Ван дэр Белену за цёплы прыём і адкрытую, змястоўную размову.

«Аўстрыя — важны і надзейны партнёр Беларусі ў нашай агульнай Еўропе. Мы надаём вялікае значэнне развіццю ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва і ў поўнай меры задаволены пазітыўнай дынамікай беларуска-аўстрыйскіх адносін», — заявіў Аляксандр Лукашэнка. Паводле слоў беларускага лідара, праведзеныя перагаворы зноў прадэманстравалі, што падыходы краін па асноўных праблемах даволі блізкія.

Прэзідэнт адзначыў, што аўстрыйскі вопыт у многіх сферах можа быць ужыты ў Беларусі. Беларускі бок высока цэніць намаганні Вены, накіраваныя на навядзенне мастоў паміж асноўнымі геапалітычнымі цэнтрамі, зніжэнне напружанасці ў Еўропе і свеце. Мінск ставіць такія ж мэты ў сваёй знешнепалітычнай дзейнасці.

«Канстатуем, што разам здольны зрабіць важкі ўнёсак у аднаўленне стабільнасці і ўмацаванне міжнароднай бяспекі. Беларусь будзе ўдзячная аўстрыйскаму кіраўніцтву за падтрымку нашых ініцыятыў у гэтым кірунку», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

### ЕС: тварам да Беларусі

Кіраўнік беларускай дзяржавы паведаміў, што бакі дамовіліся працягваць сумесную работу ў рамках міжнародных арганізацый. Беларусь падтрымае кандыдатуру Аўстрыі на выбарах у склад непастаянных членаў Савета Бяспекі ААН на 2027—2028 гады.

Прадметна абмеркавана тэматыка аховы навакольнага асяроддзя, процідзеяння негатыўным змяненням клімату. Беларусь падтрымлівае ініцыятыву па павышэнні кліматычных амбіцый, якая вылучана Прэзідэнтам Аўстрыі, аб неабходнасці канкрэтных дзеянняў для прадухілення глабальнага кліматычнага крызісу.

«Дарэчы, Мінск паслядоўна ў аднабаковым парадку ўзнімае для сябе планку па скарачэнні выкідаў парніковых газаў», — заўважыў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў падтрымку Аўстрыяй намаганняў беларускага боку па развіцці адносін з Еўрасаюзам, які з'яўляецца для Беларусі другім па значнасці гандлёвым партнёрам.

Апошнім часам, у тым ліку дзякуючы актыўнай рабоце аўстрыйскага старшынства ў 2018 годзе, ЕС становіцца для Беларусі таксама важкім палітычным і інвестыцыйным партнёрам. Толькі за апошнія два гады аб'ём фінансавай падтрымкі Еўрапейскім інвестыцыйным банкам і Еўрапейскім банкам рэканструкцыі і развіцця праектаў у беларускім дзяржсектары дасягнуў 700 мільёнаў еўра.

Беларусь актыўна працуе з ЕС у рамках шматлікіх праграм у сферах экалогіі, энергаэфектыўнасці, уладкавання граніц, рэгулявання міграцыі, падтрымкі дзяржкіравання. «Сёлета Беларусь з Еўрасаюзам зацвердзілі праекты пагадненняў па спрашчэнні выдачы віз і аб рэадмісіі. Спадзяёмся падпісаць іх у найбліжэйшы час», — заявіў кіраўнік нашай дзяржавы.

### Аднавіць добрыя традыцыі

Аляксандр Лукашэнка заявіў, што ў Беларусі і Аўстрыі даўнія традыцыі паспяховага эканамічнага ўзаемадзеяння. Яшчэ ў часы Савецкага Саюза аўстрыйскі бізнес прысутнічаў у Беларусі. У прыклад Прэзідэнт прывёў удзел Аўстрыі ў стварэнні Беларускага металургічнага завода ў Жлобіне, які і сёння застаецца адным з флагманаў нашай прамысловасці.

Кіраўнік дзяржавы канстатаваў, што і ў сучаснай Беларусі аўстрыйскі бізнес займае досыць трывалыя пазіцыі. Амаль пяцьсот кампаній з Аўстрыі супрацоўнічаюць з беларускімі прадпрыемствамі, каля сотні з іх у той ці іншай форме прадстаўлены непасрэдна ў Беларусі.

«Гэта сведчыць пра высокі ўзровень даверу аўстрыйскага бізнесу да нашай краіны. Аўстрыя даўно і трывала ўвайшла ў лік лідараў па аб'ёме інвестыцый у эканоміку Беларусі. Капіталаўкладанні ў нашу краіну штогод вылічаюцца сотнямі мільёнаў долараў. Напрыклад, летась гэтая лічба склала каля трохсот мільёнаў долараў», — сказаў Прэзідэнт. Ён заявіў, што з удзелам аўстрыйскіх кампаній прапрацоўваюцца новыя праекты на агульную суму звыш мільярда долараў.

### Больш чым эканоміка

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што краіны і народы звязвае не толькі эканоміка. Зайшла размова і аб Малым Трасцянцы. Лясны масіў пад Мінскам увайшоў у гісторыю як месца масавага знішчэння людзей нацысцкімі злачынцамі. Сярод ахвяр Трасцянца — больш за дзесяць тысяч аўстрыйскіх грамадзян.

«Мы разумеем, якое вялікае значэнне мае захаванне памяці пра ахвяр Халакосту для аўстрыйскага грамадства», — адзначыў беларускі лідар. Ён выказаў удзячнасць Прэзідэнту Аўстрыі за ініцыятыву ўстанаўлення ў Малым Трасцянцы асобнага помніка загінулым грамадзянам Аўстрыі. «За тое, што ён паказаў прыклад адказнасці і прыстойнасці ў дачыненні да тых, хто загінуў тады. Паказаў прыклад тым, хто павінен быў даўно зрабіць гэтаксама, як аўстрыйскае кіраўніцтва», — адзначыў беларускі лідар.

СТАР. 2

# ГЛУША З ВІДАМ НА АДАМОВІЧА

*«Звязда» працягвае друкаваць матэрыялы ў падтрымку адкрыцця ў пасёлку Глуша Бабруйскага раёна музея, прысвечанага творчасці Алеся Адамовіча*

**На малой радзіме аўтара «Вайны пад стрэхамі» і «Сыны ідуць у бой» урачыста адкрылі першы ў Беларусі яго бюст**

**Ужо столькі было напісана пра гэты помнік, што нават цяжка нешта новае дадаць. Важна адно — ён цяпер ёсць. Стаіць насупраць той самай «варшаўкі», якую пісьменнік апеў у сваёй дылогіі «Партызаны». За ім — пасялковы Дом культуры, дзе праходзяць знакавыя падзеі ў жыцці Глушы. Напрыклад, у суботу, калі быў адкрыты помнік, тут адзначалі свята пасёлка. Праўда, сімвалічна? Прычым удвайне: усё адбылося ў Год малой радзімы. Прыклад вельмі яскравы і паказальны.**


Хвалюючы момант адкрыцця.

### Аб'яднаныя Глушай

Свята пасёлка наогул атрымалася з адамовіцкім ухілам. Гэтае прозвішча было ва ўсіх на вуснах. З раніцы імжыў дождж, але жыхары Глушы ішлі на месца падзей з кветкамі, з дзецьмі. І гасцей прыехала болей, чым можна было чакаць. З тэлекамерамі, фотаапаратамі, дыктафонамі — кожны хацеў неяк захаваць для сябе і іншых на памяць гэты ўрачысты момант. Нечакана я сустрэла гераяў свайго артыкула пра праект «Глуша Адамовіча» — Таццяну і Віктара Корзунаў з Канюхоў. Яны прымчаліся сюды з Капыльскага раёна Мінскай вобласці, бо ўжо шмат гадоў займаюцца захаваннем імя Адамовіча і памяці пра той невялікі перыяд гісторыі, які быў звязаны з яго нараджэннем, а потым з наведваннем тамтэйшых мясцін. Некалькі гадоў таму Корзуны знайшлі дачку пісьменніка Наталлю Адамовіч, каб паведаміць ёй, што іх зямляк Анатоль Самусевіч збіраецца ўстанавіць памятны знак Алесю Адамовічу ў Канюхах — усё ж такі першыя, яшчэ неўсвядомленыя месяцы свайго жыцця ён правёў у гэтай вёсцы. Але справу да канца, на жаль, давесці не атрымалася. Анатоль Самусевіч, дарэчы, таксама прыехаў у Глушу разам з дачкой. Яна яшчэ школьніца, але піша даследчую работу пра жыццё і творчасць Адамовіча. У Глушы Анатоль пабываў на арт-прыпынку пісьменніка і натхніўся на стварэнне падобнага ў Канюхах — юрыдычна гэта зрабіць прасцей.

СТАР. 3

# ПУСК І НАЛАДКА


**У снежні плануюцца пуск узбагачальнай фабрыкі Петрыкаўскага горнаўзбагачальнага камбіната і атрыманне пробнай партыі канцэнтратаў хларыду калію. У карпусах фабрыкі завяршаецца мантаж абсталявання. Спецыялісты, сярод якіх і зваршчык Дзмітрый ІСАЕНЯ *(на фота)*, ужо пачалі падключаць яго да энергазабеспячэння і прыступілі да пуска-наладачных работ.**

Фота БелТА.

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Сусветная эканоміка падрыхтавалася да крызісу

Індыкатар дзелавых настрояў у свеце знізіўся ў чацвёртым квартале на 86,1 працэнта ў гадавым вылічэнні. Пра гэта гаворыцца ў дакладзе нямецкага Інстытута эканамічных даследаванняў (IFO), вытрымкі з якога прыводзіць Deutsche Welle. Цяперашні паказчык з'яўляецца самым нізкім з 2009 года, калі сусветная эканоміка працягвала аднаўляцца ад глабальнага крызісу. «Эксперты прагназуюць значна слабейшы эканамічны рост у сусветным гандлі, памяншэнне прыватнага спажывання і зніжэнне інвестыцый», — адзначаецца ў дакуменце. Пры гэтым аўтары песімістычна ацэньваюць як бягучую сітуацыю, так і перспектывы сусветнай эканомікі. Найбольшыя апасенні звязаныя з глабальнай гандлёвай вайной і нявызначанасцю вакол Brexit. Адзначаецца, што інвестыцыйны клімат пагаршаецца практычна ва ўсіх рэгіёнах свету. Разам з тым Bloomberg прыводзіць вынікі апытання 39 эканамістаў, удзельнікі якога выказалі здагадку, што статыстычныя звесткі пра эканоміку Германіі, якія яшчэ не апублікаваныя, пакажуць працяг спаду і фактычна зафіксуюць рэцэсію.

### Назарбаеў прапанаваў арганізаваць сустрэчу Пуціна і Зяленскага

Першы прэзідэнт Казахстана Нурсултан Назарбаеў заявіў на пятым штогадовым палітычным форуме «Астана Клуб», што прапанаваў арганізаваць сустрэчу паміж прэзідэнтамі Расіі і Украіны Уладзімірам Пуціным і Уладзімірам Зяленскім. Пра гэта паведаміла казахскае агенцтва Tengrinews. Паводле яго слоў, Зяленскі адказаў згодай. «Я ўжо атрымаў згоду Зяленскага на тэт-а-тэт, пра гэта паведаміў прэзідэнту Расіі. Цяпер паглядзім. Калі нейтральная пляцоўка патрэбна, я прапанаваў Казахстан», — цытуе агенцтва словы Назарбаева. «Я лічу, што патрэбна асабістая сустрэча прэзідэнтаў Расіі і Украіны [для ўрэгулявання сітуацыі. — **«Зв.»**]», — падкрэсліў першы прэзідэнт Казахстана. Як вядома, днямі адбылася тэлефонная размова паміж Уладзімірам Пуціным і Нурсултанам Назарбаевым, падчас якой яны абмеркавалі шэраг міжнародных пытанняў, у тым ліку ўрэгуляванне становішча ва Украіне. У канцы кастрычніка Назарбаеў у Токіа сустрэўся з Зяленскім.




ISSN 1990 - 763X


### У паўднёвай частцы Францыі адбыўся моцны землятрус

Спачатку паведамлялася пра падземныя штуршкі магнітудай 5,4, затым сейсмолагі адкарэктавалі звесткі, паменшыўшы яе да 4,9. Эпіцэнтр землятрусу знаходзіўся за два кіламетры на паўднёвы захад ад камуны Рашмор у дэпартаменце Ардэш, а гіпацэнтр — на глыбіні 10 кіламетраў, інфармуе Еўрапейска-Міжземнаморскі сейсмалагічны цэнтр (EMSC). У выніку землятрусу ёсць разбурэнні і пацярпелыя, аб якіх паведамілі ўлады дэпартаментаў Дром і Ардэш, перадае RFI. Падземныя штуршкі адчуваліся на шырокай тэрыторыі: ад Ліёна да Манпелье. Асабліва пацярпеў населены пункт Ле-Тэй у дэпартаменце Ардэш. Мясцовыя ўлады рэкамендавалі жыхарам гэтай камуны не заходзіць у будынкі з-за пагрозы абвальвання. Мясцовыя жыхары ў сацсетках публікуюць фота сапсаваных перакрыццяў і сцен свайго жылля, паведамляе ТАСС. Паводле інфармацыі Franceinfo, на атамных электрастанцыях «Трыкастэн» і «Круа», якія знаходзяцца непадалёк ад эпіцэнтра землятрусу, пашкоджанняў няма.

## КОРАТКА

• Больш за 500 чалавек выказала жаданне служыць у IT-роце за час яе існавання.

• **У Мінску ў 2020 годзе плануецца ўвесці ў эксплуатацыю школу, паліклініку і 8 дзіцячых садкоў.**

• Конкурс «Лесаруб-2019» прайшоў учора падчас першага міжнароднага лясного фестывалю ў Полацку.



• **На тэрыторыі парка баявых машын у механізаванай брыгадзе ў Гродне адбыўся пажар. Пацярпелых няма.**

Сумесны праект „Звязды" і Міністэрства па надзвычайных сітуацыях

ЖЫВІЦЕ Ў БЯСПЕЦЫ!

# ПАЖАР НА ЧАТЫРОХ КОЛАХ

## Як пазбегнуць узгарання аўто?

**Сучасны аўтамабіль — гэта не толькі сродак вельмі камфортнага перамяшчэння, але і, на жаль, добрая крыніца агню. Ратавальнікі кажуць, што цяперашняя аўтамашына можа згарэць да неаднаўляльнага стану літаральна за 5—6 хвілін. Такая плата за тое, што ў сучасных машынах выкарыстоўваецца даволі шмат пластыку. Але гэта не азначае таго, што з агнём змагацца бессэнсоўна. Аб тым, як гэта правільна зрабіць, расказалі ў Міністэрстве па надзвычайных сітуацыях.**



### Скінуць клему

— Спачатку трэба выклікаць ратавальнікаў, паведаміўшы як мага больш дакладна каардынаты месца, дзе вы знаходзіцеся, — раяць у прэс-службе МНС. — Але да іх прыезду вельмі пажадана ўтрымаць полымя пад кантролем. Калі загарэўся маторны адсек, то трэба крыху прыадкрыць капот, каб плынь свежага паветра не ўзмацніла гарэння. Па магчымасці скіньце адмоўную клему акумулятара, бо інакш батарэя будзе падпальваць праблемнае месца раз за разам, — і пускайце ў ход вогнетушыцель. Парашковы ён будзе ці вуглекіслотны — няважна. Галоўнае, не пашкадаваць грошай загадзя і набыць балон, які будзе змяшчаць больш за пяць літраў рэчыва. Калі ж купіць у аўтамабіль вогнетушыцель малалітражны, дзеля «галачкі», то ў крытычнай сітуацыі сэнсу ад яго можа быць няшмат. А вось ваду заліваць у маторны адсек нельга ні ў якім разе. Гэта выкліча кароткае замыканне электраправодкі і... дадатковы ачаг полымя. Для тушэння невялікіх узгаранняў падыдзе нават шчыльная тканіна, якая перакрые доступ кіслароду. Але калі, нягледзячы на ўсё, справіцца з агнём не атрымалася, то адзінае, што застаецца, — гэта бегчы што ёсць сілы як мага далей. Сваімі сіламі патушыць пажар ужо не атрымаецца, а рызыка выбуху бензабака ўзрастае шматкроць.

СТАР. 3

# У НАШАЙ АГУЛЬНАЙ ЕЎРОПЕ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Аляксандр Лукашэнка лічыць, што важна працягваць такое супрацоўніцтва, пашыраць кантакты навуковых і музейных устаноў, гісторыкаў, якія займаюцца тэмай Трасцянца. Ён таксама расказаў аб перадачы беларускім бокам Дому гісторыі Аўстрыі прадметаў, якія належалі аўстрыйскім грамадзянам, забітым нацыстамі ў лагеры смерці «Трасцянец». Гэтыя артэфакты былі нядаўна выяўленыя падчас археалагічных раскопак.

Пры абмеркаванні гуманітарнай тэмы Аляксандр Лукашэнка ад сябе асабіста і народа Беларусі падзякаваў у асобе Федэральнага прэзідэнта ўсім аўстрыйцам, якія дапамагаюць у аздараўленні дзяцей з рэгіёнаў Беларусі, пацярпелых ад чарнобыльскай катастрофы.

У заключэнне Прэзідэнт падкрэсліў, што Беларусь шчыра зацікаўлена ў паглыбленні супрацоўніцтва з Аўстрыяй ва ўсіх галінах узаемнай цікавасці.

«Паверце, я ведаю розныя тэндэнцыі ў ЕС у плане Беларусі. Хачу сказаць, спадар Прэзідэнт, можа быць, не сёння, не заўтра, але паслязаўтра дакладна вы будзеце ганарыцца тым, што калісьці прыехалі ў Беларусь, паглядзелі на гэтую краіну, пераканаліся, што гэта не чужая для Еўропы краіна, і сказалі, што тут жывуць годныя людзі. Вы ніколі не пашкадуеце аб гэтым. Беларусь — гэта цэнтр Еўропы, гэта еўрапейская краіна, і яе палітыка накіравана на выключна мірныя, дружалюбныя, узаемавыгадныя адносіны не толькі з суседзямі, але і з нашымі даўнімі, праверанымі сябрамі, якім з'яўляецца ваша выдатная і багатая краіна», — рэзюмаваў беларускі лідар.

## Няма забароненых тэм

Пасля перагавораў з Аляксандрам Ван дэр Беленам Прэзідэнт адказаў на пытанні журналістаў, у тым ліку наконт магчымасці адмены ў Беларусі смяротнага пакарання.

«Рэферэндум вырашыў гэтую праблему. Толькі рэферэндум можа яго адмяніць. Мы ў гэтым кірунку рухаемся», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Ён канстатаваў, што ЕС ад Беларусі ўжо патрабуе адмены смяротнага пакарання. «І, вядома, мы да гэтага абыякава ставіцца не можам, калі ўжо зусім шчыра. І вельмі часта праводзім апытанні з нагоды адмены смяротнага пакарання. Нічога з тых часоў, як пытанне было вырашана на рэферэндуме, не змянілася. Ці варта гэтае пытанне сёння выносіць на рэферэндум, каб атрымаць адмоўны адказ? Думаю, не варта. Таму мы дамовіліся калісьці з палітыкамі ў Бруселі ў гэтым кірунку працаваць разам. І выпрацавалі нейкі план, дарожную карту па рабоце з беларускім грамадствам. Мы ў гэтым кірунку рухаемся. Паспешнасць тут можа толькі нашкодзіць», — адзначыў беларускі лідар.

«Што датычыцца Савета Еўропы і нашага членства (у якасці ўмовы вылучаюцца патрабаванні адмены ці ўвядзення мараторыя на прымяненне смяротнай кары. — **«Зв.»**): прымеце — дзякуй, не — пацерпім», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён назваў Беларусь «абсалютна адкрытай краінай».

«Смею запэўніць, больш, чым вы. Грамадзяне прыкладна 90 дзяржаў маюць магчымасць без віз уязджаць у «аўтарытарную» Беларусь. Мы абсалютна адкрыты для ўсіх», — прывёў прыклад кіраўнік дзяржавы. Ён параіў журналісту, які задаваў пытанне і раней ні разу не бываў у Беларусі, перш чым даваць ацэнкі, наведаць краіну і ацаніць сітуацыю асабіста.

## Галоўныя правы

Прэзідэнт адзначыў, што часам незразумела, што маецца на ўвазе, калі задаецца пытанне на тэму захавання правоў чалавека: «Што вам не падабаецца ў Беларусі ў плане правоў чалавека? Ёсць права на жыццё. Гэта галоўнае права. Права на працу — чалавек павінен мець гарантыю працаваць у сваёй краіне. А калі ёсць жаданне — паехаць у Аўстрыю, Польшчу ці іншыя краіны. Вы хочаце сказаць, што мы камусьці забараняем гэты выезд? Не скажаце».

Кіраўнік дзяржавы адзначыў таксама, што ёсць агульнапрызнанае права на атрыманне адукацыі, і не проста адукацыі, а за кошт дзяржавы. У Беларусі грамадзяне атрымліваюць агульную сярэднюю адукацыю, а каля паловы затым атрымлівае бясплатную вышэйшую адукацыю. Акрамя таго, у краіне бясплатная ахова здароўя для ўсіх грамадзян.

«Я хацеў бы, каб вы назвалі хоць бы адну краіну ў Еўрасаюзе, якая змагла б пахваліцца гэтымі дасягненнямі. Але калі журналіст мне задае пытанне па некаторых правах чалавека, я адразу ў яго вачах чытаю адно нямое пытанне: СМІ і іншае... Вы калі-небудзь чулі, што ў Беларусі забаранілі інтэрнэт? Напэўна, гэтыя папрокі ўжо даўно адышлі ў нябыт. Сёння немагчыма нешта забараніць, асабліва ў СМІ», — заўважыў Прэзідэнт.

## Лепш аднойчы ўбачыць

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што пытанне журналіста на тэму правоў чалавека традыцыйнае, але абсалютна нічога не мае агульнага з рэчаіснасцю ў Беларусі.

«Яшчэ раз запрашаю вас, як шматлікіх журналістаў, пабываць у нас у Беларусі. Падстаў для гэтага было шмат, у тым ліку II Еўрапейскія гульні. У будучыні чэмпіянат свету (па хакеі ў 2021 годзе. — **«Зв.»**) мы разам з латышамі праводзім. Ці можаце раней прыехаць, каб азнаёміцца», — запрасіў беларускі лідар.

«Упэўнены, калі раней прыедзеце, то ў 2021 годзе вы прыедзеце ўсёй сям'ёй і са сваімі сябрамі ў Беларусь. Гэта краіна, куды хочацца вярнуцца любому чалавеку. І гэта краіна, дзе можна ціха і бяспечна адпачыць», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Ён дадаў, што нядаўна прачытаў у аглядзе меркаванне аднаго аўстрыйца, які ўпершыню наведаў Беларусь і быў уражаны бяспекай, адкрытасцю людзей і тым жыццём, якім жывуць у краіне.

«Я спадару Прэзідэнту сказаў: так, мы пакуль не так багатыя матэрыяльна. Але вы ведаеце, багацце — гэта не толькі матэрыяльнае, гэта перш за ўсё духоўнае, — упэўнены кіраўнік дзяржавы. — Наша краіна ў гады апошняй вайны была сцёртая з зямлі. І калі б мы не мабілізаваліся, не пабудавалі вось гэтую аўтарытарную, як вы сказалі, уладу, мы б сёння не мелі суверэннай і незалежнай Беларусі».

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу і на няпростую сітуацыю вакол Беларусі, якая «заціснута» паміж Усходам і Захадам. «Беларускі народ для мяне, ды і для Еўропы, — найвялікшая каштоўнасць. І інтарэсаў гэтага народа мы будзем заўсёды прытрымлівацца», — запэўніў Прэзідэнт.

## Цікавасць узаемная

У сваю чаргу, Аляксандр Ван дэр Белен адзначыў, што Аўстрыя цэніць цікавасць Беларусі да паглыблення адносін. «Хацелі б сказаць, што гэта ўзаемна. Мы будзем заставацца ў кантакце. І гэта будзе не апошні візіт у Аўстрыю і Беларусь», — паабяцаў аўстрыйскі Федэральны прэзідэнт.

Адначасова з візітам Аляксандра Лукашэнкі ў Вене прайшоў аўстрыйска-беларускі бізнес-форум, у якім удзельнічалі дзелавыя колы дзвюх краін, у тым ліку прадстаўнікі буйнога бізнесу. Падчас афіцыйнага візіту ў Аўстрыю падпісаны шэраг двухбаковых дакументаў і бізнес-пагадненняў аб развіцці супрацоўніцтва па розных кірунках.

У прыватнасці, Аўстрыя дапаможа Беларусі з укараненнем тэхналогіі 5G. Гэта прадугледжана сумеснай дэкларацыяй аб умацаванні супрацоўніцтва ў галіне сувязі, інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій і развіцця шырокапалоснай сеткі 5G, якая таксама падпісана ў Вене ў ходзе афіцыйнага візіту Прэзідэнта ў Аўстрыю.

Таксама кіраўнік дзяржавы сустрэўся са старшынёй Нацыянальнага савета Аўстрыі Вольфгангам Саботкам. Прэзідэнт пакінуў запіс на беларускай мове ў кнізе ганаровых гасцей аўстрыйскага парламента.

**Паводле БелТА.**

У полі зроку КДК

# ЦІ ЁСЦЬ ПАТРЭБА Ў КАЦЕЛЬНЯХ?

## Пераход на мясцовыя віды паліва ідзе марудна

**У Гродзенскай вобласці з году ў год пераносіцца ўвод кацельняў на мясцовай энергасыравіне. На 2020 год такіх аб'ектаў набралася каля дзясятка. Марудныя тэмпы адмоўна ўплываюць на выкананне праграмы па энергазберажэнні. На праблему звярнулі ўвагу ў КДК Гродзенскай вобласці.**

Калі папярэднія гады праграма па эканоміі паліва выконвалася, то летась было відавочнае адставанне ад плана. У рэгіёне нявыкананы мэтавы паказчык па энергазберажэнні, такая тэндэнцыя захавалася і ў першым паўгоддзі сёлета.

У камітэце па архітэктуры і будаўніцтве Гродзенскага аблвыканкама падобны спад тлумачаць шэрагам правальных праектаў з боку гігантаў энергаспажыўцоў — прадпрыемстваў «Краснасельскбудматэрыялы» і «Гродна Азот». Заводы не ў поўнай ступені забяспечваюць тыя мерапрыемствы, якія даводзяцца ім мясцовымі ўладамі. Напрыклад, «Краснасельскбудматэрыялы» замест запланаванай 21 тысячы тон умоўнага паліва эканоміла 4,5 тысячы. «Гродна Азот» — выканаў абласное заданне толькі напалову.

У сваю чаргу, кіраўніцтва рэгіёна не ў стане ўплываць на сітуацыю, бо прадпрыемствы маюць рэспубліканскае падпарадкаванне. А тыя планы, якія даводзяць па энергазберажэнні ўласнікі заводаў-гігантаў, значна меншыя за абласныя. Такім чынам атрымліваецца, што ведамасныя планы імі выконваюцца, а вось да абласной праграмы яны значна не дацягваюць. Але справа не толькі ў заводах-гігантах. Лакальныя заданні па эканоміі энергарэсурсаў не выконваюцца і іншымі спажыўцамі. Маўляў, праграма на будучы год фарміруецца яшчэ ў маі бягучага, і многія прадпрыемствы не могуць рэальна ацаніць свае здольнасці.

А між тым, падкрэсліў **старшыня КДК Гродзенскай вобласці Анатоль ДАРОЖКА**, праблема энергазберажэння вельмі актуальная для Беларусі, бо краіна не мае дастатковага рэсурснага патэнцыялу. Каб адпавядаць сусветным нормам, трэба ісці па шляху павышэння энергаэфектыўнасці і павелічэння ўласных паліўна-энергетычных рэсурсаў. Тым больш што ў краіне зацверджана адпаведная праграма па энергазберажэнні, якая разлічана да 2020 года.

У КДК прааналізавалі, як ідзе будаўніцтва кацельняў на мясцовых відах паліва. І аказалася, што іх увод у эксплуатацыю пераносіцца з году ў год. Такім чынам, сёлета ў сувязі з пераносам трэба здаць пяць аб'ектаў, а налета — восем. Іх сумарная магутнасць складае 66 % усіх аб'ектаў пяцігодкі. У дзяржкантролі лічаць, што завяршыць у тэрмін здачу запланаваных аб'ектаў проста нерэальна.

— Ужо цяпер бачна, што і ў будучым годзе праграма пад пагрозай, — лічыць Анатоль Дарожка. — Напрыклад, невядома, як будзе будавацца кацельня ў гарадскім пасёлку Рось магутнасцю 21 мегават. На аб'ект няма праекта, не вызначаны крыніцы фінансавання.

Пакуль здадзена толькі дзве кацельні з пяці — у Навагрудскім і Ваўкавыскім раёнах, да таго ж з адставаннем ад графіка. Яшчэ тры кацельні перанесены на снежань гэтага года. А вось самая буйная энергакрыніца ў Росі пакуль у падвешаным стане, хоць кацельня ўнесена ў дзяржаўную праграму ў лік аб'ектаў, якія фінансуюцца за кошт сродкаў Міжнароднага банка рэканструкцыі і развіцця.

Зрэшты, будучыя ўласнікі — Ваўкавыская ЖКГ — выступаюць супраць будаўніцтва аб'екта. Маўляў, у населеным пункце ёсць некалькі кацельняў, якія забяспечваюць патрэбу ў энерганосьбітах, да таго ж могуць узнікнуць праблемы з пастаўкай паліўных шчэпак. Між тым у Росі назіраецца рост насельніцтва, тут будуецца амаль што новы пасёлак, і патрэба ў паліўных рэсурсах значна вырасце.

Самае недарэчнае, калі не выконваюцца мерапрыемствы, у якія ўкладзены сродкі. Справа датычыцца менавіта мясцовых відаў паліва. Некаторыя прадпрыемствы наогул адмаўляюцца ад прапаноў па энергазберажэнні ў гэтым кірунку. А між тым рэзервы ёсць ва ўсіх, упэўнены **намеснік начальніка Гродзенскага абласнога ўпраўлення па наглядзе за рацыянальным выкарыстаннем паліўна-энергетычных рэсурсаў Андрэй МІНЬКО**. У гэтым сэнсе станоўча спрацавалі жыллёва-камунальныя службы, хоць ім павялічылі заданне ў два разы. Узнікае пытанне: адкуль эканомія? Ці не за кошт спажыўцоў?

— Гэта не значыць, што трэба адключаць ацяпленне ці знізіць спажыванне, — кажа Андрэй Мінько. — Эканомія складаецца з шэрагу мер — вокны памяняць, зрабіць цеплавую мадэрнізацыю, магчыма, крыніцу энергіі ўдасканаліць. Дарэчы, амаль палова кацельняў у сістэме ЖКГ пераведзена на мясцовыя віды паліва. Таксама ў гэтым сезоне звернута асаблівая ўвага на правільнае захаванне дроў і шчэпак.

Як паведамілі ў КДК, пытанні энергазберажэння патрабуюць пільнага кантролю. Пакуль праблема не мае сістэмнага падыходу і ўсебаковага аналізу. Магчыма, гэта адбіваецца на выкананні плана. Напрыклад, летась у вобласці не забяспечана эканомія 141 тысячы тон умоўнага паліва. Далёка не ўсе спажыўцы выканалі даведзеныя заданні нават пасля таго, як план быў значна скарэктаваны. Аналагічная сітуацыя назіраецца і сёлета. За паўгода аб'ём эканоміі склаў 86 % ад плана, што сведчыць аб нерацыянальным выкарыстанні паліўных рэсурсаў, сцвярджаюць у КДК Гродзенскай вобласці.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

# Выбіраць ужо можна

## Учора пачалося датэрміновае галасаванне па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу



Фота БелТА.

Яно можа стаць асабліва актыўным, таму што на гэтым тыдні — рабочая субота. Такую думку выказала журналістам **старшыня Цэнтральнай камісіі Беларусі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Лідзія ЯРМОШЫНА** перад пасяджэннем камісіі.

«Думаю, выбаршчыкі скарыстаюцца магчымасцю прагаласаваць датэрмінова, каб вызваліць адзіны выхадны. З улікам таго, што ў нас вялікая колькасць кандыдатаў, няма ніводнай безальтэрнатыўнай акругі, упэўнена, што ў выбаршчыкаў ёсць цікавасць да выбараў і яны на іх прыйдуць», — прагназуе Лідзія Ярмошына. Кіраўнік ЦВК ужо запланавала дзень, калі сама будзе галасаваць датэрмінова.

Старшыня камісіі паведаміла журналістам, што ў перадвыбарнай гонцы засталося 516 кандыдатаў. У дачыненні да трынаццаці скасаваны рашэнні аб рэгістрацыі, а трыццаць тры кандыдаты знялі свае кандыдатуры добраахвотна.

На пасяджэнні ЦВК разгледжана скарга Юрыя Мельнікава на рашэнне Віцебскай абласной выбарчай камісіі аб скасаванні рашэння аб рэгістрацыі кандыдата ў дэпутаты. Цэнтральная камісія адмовіла ў задавальненні скаргі.

Як паведамляе БелТА, з 11 да 18 лістапада асабовы склад органаў унутраных спраў і ўнутраных войскаў пераведзены на ўзмоцнены варыянт нясення службы. Арганізавана работа аператыўных штабоў у Міністэрстве ўнутраных спраў і ва ўсіх тэрытарыяльных органах унутраных спраў.

Міліцыя ўзяла ўдзел у абследаванні ўсіх выбарчых участкаў — правяралася тэхнічная ўмацаванасць, адпаведнасць мерам грамадскай бяспекі. Асаблівая ўвага ўдзелена падрыхтоўцы памяшканняў для галасавання ў месцах пазбаўлення волі.

У дзень выбараў, 17 лістапада, у рэжым павышанай гатоўнасці пяройдуць і падраздзяленні Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. На ўсіх выбарчых участках будзе дзяжурыць інжынерна-інспектарскі склад. З пункту гледжання пажарнай бяспекі ўсе ўчасткі знаходзяцца ў парадку.

**Варвара МАРОЗАВА.**

# ДЗЕЛЯ АГУЛЬНАГА ЗДАРОЎЯ

## Беларусы змогуць лячыцца ў расійскім цэнтры ядзернай медыцыны

**Беларусі і Расія будуць супрацоўнічаць у галіне анкалогіі. Пра гэта расказала міністр аховы здароўя Расіі Вераніка СКВАРЦОВА, якая прыехала ў Беларусь для ўдзелу ў сумеснай калегіі профільных міністэрстваў абедзвюх краін «Неўралогія і нейрахірургія».**

— Нас цікавіць кірунак анкалогіі. Мы плануем супрацоўнічаць, пераходзячы да персаніфікаваных падыходаў. Гэта датычыцца і сучасных анкавакцын, і анкалітычных вірусаў, і клетачных тэхналогій, — расказала міністр. — Будзем супрацоўнічаць і ў галіне радыедыягностыкі і радыетэрапіі, пратонных тэхналогій. У Расіі мы адкрылі цэнтр ядзернай медыцыны — у Дзімітраўградзе. Там знаходзяцца чатыры самыя сучасныя ў свеце пратонныя ўстаноўкі — не толькі для дарослых, але і для дзяцей. Гэта самы магутны цэнтр у Еўропе, і ён будзе аказваць дапамогу і пацыентам з Беларусі.

Вераніка Скварцова паведаміла, што за апошнія два гады ў Расіі прайшлі лячэнне — як амбулаторнае, так і стацыянарнае — каля 55 тысяч беларусаў. У сваю чаргу, **міністр аховы здароўя Беларусі Уладзімір КАРАНІК** паведаміў, што з пачатку года больш за 70 тысяч расіян атрымала медыцынскую дапамогу ў Беларусі.

Таксама расійскі міністр паведаміла пра падрыхтоўку сумеснага праекта ў галіне антымікробнай рэзістэнтнасці (устойлівасці мікраарганізмаў да супрацьмікробных прэпаратаў, якімі раней лячылі інфекцыю).

— Гэта праблема, якая з'яўляецца асновай экалагічнай бяспекі ва ўсім свеце. Яе трэба вырашаць і праз сельскую гаспадарку, і праз падрыхтоўку ўрачоў, і праз тлумачальную работу з насельніцтвам, і праз стварэнне новых альтэрнатыўных антыбіётыкаў, якія дзейнічаюць па іншых механізмах.

Працягваецца ўзаемадзеянне і ў галіне ствалавых клетак. Новы праект па рэгенератыўнай медыцыне стане працягам папярэдняга, які праходзіў з 2013 да 2017 года.

Вераніка Скварцова расказала, што наведвае Мінск трэці раз. Яе продкі, у прыватнасці прадзед і прабабуля, а таксама дзядуля, жылі ў Гомелі. Беларусь міністр назвала брацкай краінай не толькі з агульнай гісторыяй, але і з падобнымі сучаснымі заканамернасцямі, у прыватнасці дэмаграфічнымі. Сферамі супрацоўніцтва, дзе абедзвюм краінам удалося дасягнуць пэўных поспехаў, яна назвала зніжэнне мацярынскай і дзіцячай смяротнасці, барацьбу з сацыяльнымі інфекцыямі, павелічэнне працягласці жыцця.

**Алена КРАВЕЦ.**


**ООО «СпецРеализация» объявляет о проведении открытых торгов в форме аукциона по продаже имущества ООО «Комплайнинвест» (УНП 192936454, г. Минск, пр-т Партизанский, д. 23А, пом. 1Н, комната 1), находящегося в процедуре экономической несостоятельности (банкротства).**

***Дата и время проведения торгов:* 16 декабря 2019 года**. Начало – 10.00. Заявки принимаются с 13 ноября 2019 года по 13 декабря 2019 года.
***Место проведения торгов:*** Минск, пр-т Победителей, 31-1, комната переговоров ОАО «Гостиница Планета».
***Организатор торгов:*** ООО «СпецРеализация» (УНП 691842036, 223060, Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 41), тел. 8 (029) 684-71-76.
***Продавец:* ООО «Комплайнинвест» (УНП 192936454)** в лице управляющего Частного унитарного предприятия «Правовая компания «БелПрофКонсалт», тел. 8 (033) 653-38-17.

| № лота | Предмет торгов | Начальная цена, руб. | Шаг торгов | Задаток |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Изолированное помещение с инв. № 100/D-102846 (назначение – торговое помещение с долей вспомогательных помещений, наименование – магазин) 1973 года постройки, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Кривошеина, 9-97, площадь – 1595,2 м кв. Сведение о земельном участке: кадастровый номер участка – 140100000001005257 (доля 731/2500 в праве постоянного пользования, доля 3457/5000 в праве постоянного пользования КУП «Жилищное ремонтно-эксплуатационное управление г. Бреста», доля 81/5000 в праве постоянного пользования ООО «БелРиэлтКомпани»), площадь земельного участка – 0,3694 га, назначение – обслуживание жилого дома со встроенным магазином | **971 376,00** | **5 %** | **5 %** |

Для участия в торгах необходимо:
1. В срок до 17.00 **13 декабря 2019 года** перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY56MTBK30120001093300086460 в ЗАО «МТБанк», код MTBKBY22, УНП 691842036, получатель – ООО «СпецРеализация».
2. Подать организатору торгов в срок с даты опубликования до 17.00 13.12.2019 заявление на участие в торгах с приложением документов, перечисленных в ст. 127 Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)».
3. В день проведения торгов перед их началом участники обязаны зарегистрироваться у организатора торгов и получить аукционные (конкурсные) номера в месте проведения аукциона.
Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов.
Организатор открытых торгов после опубликования извещения о проведении торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за пять дней до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену за предмет аукциона.
Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов.
Торги по конкретному предмету торгов признаются несостоявшимися в случае, если:
– заявление подано только одним участником либо не было подано ни одного заявления;
– на торги явился один из участников, либо ни один из участников не явился.
В случае если торги, проводимые в форме аукциона, признаны несостоявшимися, предмет аукциона продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.
Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, в течение 5 дней со дня их проведения. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить Организатору торгов установленное вознаграждение в размере 3 % от цены продажи предмета торгов в течение 5 дней со дня их проведения. Победитель торгов в день проведения торгов подписывает протокол по результатам торгов. Между продавцом и победителем торгов в течение 15 дней со дня проведения торгов заключается договор купли-продажи.
Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи, но не позднее 30 дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов.



**РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже недвижимого имущества ОАО «Нерудпром»**

**Лот № 1**: КПП с инв. № 600/С-161457, площадь – 18,2 кв. м, г. п. – 2002. Адрес: Минский р-н, Петришковский с/с, 10/4, район д. Захаричи. Начальная цена с НДС – 11 184,00 бел. руб. Задаток – 4 000,00 бел. руб. Земельный участок с кадастровым номером 623685700001000370 площадью 0,1287 га. Право аренды (по 18.07.2049).
**Лот № 2**: Гараж с инв. № 600/С-161460, площадь – 67,5 кв. м, г. п. – 1995. Адрес: Минский р-н, Петришковский с/с, 10/5, район д. Захаричи. Начальная цена с НДС – 21 116,00 бел. руб. Задаток – 6 000,00 бел. руб. Земельный участок с кадастровым номером 623685700001000371 площадью 0,2439 га. Право аренды (по 18.07.2049).
**Лот № 3**: Склад строительных материалов с инв. 600/С-161456, площадь – 70,3 кв. м, г. п. – 1967. Адрес: Минский р-н, Петришковский с/с, 10/3, район д. Захаричи. Начальная цена с НДС – 11 930,00 бел. руб. Задаток – 4 000,00 бел. руб. Земельный участок с кадастровым номером 623685700001000372 площадью 0,1546 га. Право аренды (по 18.07.2049).
Переход прав на земельные участки осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь

**Аукцион состоится 25.11.2019 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4. Шаг аукциона – 5 %**

Порядок оформления участия в аукционе, условия участия в аукционе, срок заключения договора купли-продажи, условия оплаты, а также полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона ino.by.
**Продавец:** ОАО «Нерудпром», г. Минск, ул. Асаналиева, 72, тел. 8 (017) 365-66-07. **Организатор аукциона:** РУП «Институт недвижимости и оценки», 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9.
Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе 25.11.2019 (ОАО «Нерудпром», Лот №__). Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений 21.11.2019 в 11.00. Участник, желающий участвовать в аукционе в отношении нескольких лотов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из лотов. Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 15.08.2019.

**☎ Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**



**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ООО «Оксана»**

**Предмет торгов –** капитальное строение с инвентарным номером 100/С-1556 (наименование: здание социально-культурного центра; назначение: здание специализированное иного назначения), площадью 1879 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 121284004601000037, площадью 1,3028 га, по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Городская, 23

| Начальная цена, руб. (без учета НДС) | 155 400,00 | Размер задатка, руб.: | 15 540,00 |
|---|---|---|---|

**Продавец:** ООО «Оксана», г. Брест, ул. Городская, 23, УНП 200446478. **Организатор аукциона:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки». **Реквизиты для перечисления задатка:** р/с BY76BPSB30121789380179330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», Региональная дирекция № 100 по Брестской области, BIC Банка BPSBBY2X, УНП 201028245. **Условия продажи:** без условий.
**Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 20 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. **Условия оплаты:** в соответствии с заключенным договором купли-продажи

**Аукцион состоится 25 ноября 2019 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, а также иную информацию можно узнать у организатора аукциона по телефонам: 8-(0162)-20-92-13, 21-88-81, 8-(029) 626-72-52

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00

**Последний день приема заявлений – 22 ноября 2019 г. до 17.00**

* Участник аукциона, выигравший торги, оплачивает возмещение затрат Организатору аукциона

* Ранее извещение о проведении аукциона по продаже имущества ООО «Оксана» опубликовано в газете «Звязда» от 19.10.2019 г.



**ООО «СпецРеализация» объявляет о проведении открытых торгов в форме аукциона по продаже имущества ООО «Комплайнинвест» (УНП 192936454, г. Минск, пр-т Партизанский, д. 23А, пом. 1Н, комната 1), находящегося в процедуре экономической несостоятельности (банкротства).**

***Дата и время проведения торгов:* 17 декабря 2019 года**. Начало – 10.00. Заявки принимаются с 13 ноября 2019 года по 13 декабря 2019 года.
***Место проведения торгов:*** Минск, пр-т Победителей, 31-1, комната переговоров ОАО «Гостиница Планета».
***Организатор торгов:*** ООО «СпецРеализация» (УНП 691842036, 223060, Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 41), тел. 8 (029) 684-71-76.
***Продавец:* ООО «Комплайнинвест» (УНП 192936454)** в лице управляющего Частного унитарного предприятия «Правовая компания «БелПрофКонсалт», тел. 8 (033) 653-38-17.

| № лота | Предмет торгов | Начальная цена, руб | Шаг торгов | Задаток |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инвентарным номером 233/С-1648 (назначение – здание специализированное финансового назначения, наименование – здание банка), 1994 года постройки, расположенное по адресу: Витебская обл., Чашникский р-н, г. Новолукомль, ул. Энергетиков, 13, площадь – 918,7 м. кв. Сведение о земельном участке: кадастровый номер участка – 225151000002000110 в праве постоянного пользования, площадь земельного участка – 0,2625 га, назначение – земельный участок для использования под административное здание | **563 892,00** | **5 %** | **5 %** |

Для участия в торгах необходимо:
1. В срок до 17.00 **13 декабря 2019 года** перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY56MTBK30120001093300086460 в ЗАО «МТБанк», код MTBKBY22, УНП 691842036, получатель – ООО «СпецРеализация».
2. Подать организатору торгов в срок с даты опубликования до 17:00 13.12.2019 заявление на участие в торгах с приложением документов, перечисленных в ст. 127 Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)».
3. В день проведения торгов перед их началом участники обязаны зарегистрироваться у организатора торгов и получить аукционные (конкурсные) номера в месте проведения аукциона.
Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов.
Организатор открытых торгов после опубликования извещения о проведении торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за пять дней до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену за предмет аукциона.
Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов.
Торги по конкретному предмету торгов признаются несостоявшимися в случае, если:
– заявление подано только одним участником либо не было подано ни одного заявления;
– на торги явился один из участников, либо ни один из участников не явился.
В случае если торги, проводимые в форме аукциона, признаны несостоявшимися, предмет аукциона продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.
Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, в течение 5 дней со дня их проведения. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить Организатору торгов установленное вознаграждение в размере 3 % от цены продажи предмета торгов в течение 5 дней со дня их проведения. Победитель торгов в день проведения торгов подписывает протокол по результатам торгов. Между продавцом и победителем торгов в течение 15 дней со дня проведения торгов заключается договор купли-продажи.
Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи, но не позднее 30 дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов.



**Вниманию предприятий, организаций и индивидуальных предпринимателей!**

*Комитетом государственного имущества Гродненского областного исполнительного комитета проводятся аукционы по продаже неиспользуемого имущества, находящегося в собственности Волковысского района*
К ПРОДАЖЕ ПРЕДЛАГАЕТСЯ:
Комплекс объектов производственной базы в г. Волковыске по ул. Матросова, 6, 6/1, 6/2.
**Начальная цена предмета аукциона – 38 629 руб. 80 коп.**
Размер задатка – 3 900 руб.
Аукцион состоится – **9 декабря 2019 г. в 12.00.**
Заявки на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39.
Последний день подачи заявлений на участие в аукционе – **3 декабря 2019 года до 17.00**.
Подробная информация по телефонам: в городе Волковыске – 8 (01512) 4 50 25, 2 06 03; в городе Гродно – 8 (0152) 77 29 15, 72 25 18, 72 21 02.
Сайты: **www.region.grodno.by**, gki.gov.by

УНП 500042135



**ОАО «Минскоблхлебопродукт» извещает, что 25 ноября 2019 г. состоится внеочередное собрание акционеров** по адресу: г. Минск, ул. Фабрициуса, 2.

**Начало собрания в 12.00. Регистрация акционеров с 11.00.**
При себе иметь: акционеру общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

***ПОВЕСТКА ДНЯ:***
*1. О безвозмездной передаче УП «УКС Мингорисполкома» имущества, подлежащего сносу в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 22.09.2014 г. № 465 «О реализации инвестиционного проекта «Экспериментальный многофункциональный комплекс «Минск-Мир».*
*2. О внесении изменений в Устав Общества.*

УНП 600013173

# ГЛУША З ВІДАМ...

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)

Ледзь паспяваю здароўкацца з гасцямі з Магілёва — таксама героямі мінулых публікацый. Сярод іх Алег Дзьячкоў, які неаднаразова збіраў народ на сустрэчы з Натальляй Адамовіч, арганізоўваў паказ фільма «Ідзі і глядзі»; вядомы магілёўскі гісторык Аляксандр Агееў; старшыня Магілёўскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Алесь Казека... З Мінска разам з Наталляй Адамовіч прыехалі ўнучкі Якуба Коласа Марыя і Вера Міцкевіч, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Алена Анісім, іншыя ганаровыя госці. Алеся Адамовіча няма з намі ўжо чвэрць стагоддзя, а яго памятаюць, да яго едуць...

## Агульныя карані

Гісторыя — гэта тое, што аб'ядноўвае. Фотасушка ад жыхароў, выстаўка «Мы родам з СССР», да якой таксама прыклалі руку жыхары Глушы, шыкоўная экспазіцыя ад раённай бібліятэкі, прысвечаная Алесю Адамовічу, — усё гэта размясцілася пад дахам пасялковага Дома культуры. Бібліятэчныя работнікі вельмі ганарацца, што ў іх ёсць «жывы» аўтограф Алеся Адамовіча. Яго ён пакінуў падчас аднаго са сваіх візітаў сюды.

Цяпер Глуша — пасёлак сельскага тыпу, тут жыве тысяча трыста чалавек. Але раней, калі працаваў шклозавод і народу было болей, яна мела статус гарадскога. Колькасць насельніцтва паменшылася амаль напалову пасля таго, як завод у канцы 90-х закрыўся і ўсё прыйшло ў заняпад. Марыя Сушчанка, якая ў 2007 годзе ўзначальвала тады яшчэ пасялковы Савет, добра памятае той перыяд. Яна родам з Хойніцкага раёна Гомельскай вобласці, але Глуша для яе, як і для Адамовіча, стала другой радзімай. Пад яе кіраўніцтвам была напісана праграма ўстойлівага развіцця пасёлка і заснаваны фестываль «Глушанскі хутарок», які сёлета адзначыў сваё дзесяцігоддзе і на якім заўсёды папулярызуецца творчасць Алеся Адамовіча. Асаблівы гонар пасёлка — людзі, якія робяць свае падворкі паказальнымі (Адамовіч таксама пісаў, што яго землякі рэдка застаюцца ўбаку ад грамадскіх спраў). Сёлета лідараў па добраўпарадкаванні выбіралі больш чым з 20 прэтэндэнтаў. Алена і Мар'ян Шафарэвічы чарговы раз сталі яго прызёрамі. Каля іх дома шмат экзатычных дрэў — самшыты, магнолія, туі. Алена карэнная глушанка — яе дзед працаваў шкловыдзімальшчыкам на заводзе, а сама яна выкладала ў мясцовай школе біялогію і хімію. З вялікай павагай жанчына ставіцца да Алеся Адамовіча і яго родзічаў, называе іх шчырымі, самаадданымі людзьмі. Тое, што цяпер у Глушы ёсць помнік пісьменніку, яна лічыць вельмі справядлівым. Спадзяецца, што ў будучым з'явіцца і музей.

## Памяць у метале

Па традыцыі свята пасёлка пачынаецца з даніны памяці вызваліцелям Глушы ў чэрвені 1944 года. На стэле ёсць і прозвішчы некалькіх партызанаў. Гэтым разам у сувязі з адкрыццём помніка адступленнем ад традыцыйнай праграмы стала наведванне магілы Алеся Адамовіча. Там былі ўскладзены кветкі і адбылася невялікая паніхіда. Потым падзеі зноў перамясціліся ў Глушу. Ганаровае права адкрыць помнік атрымалі непасрэдны ініцыятар і рэалізатар ідэі Андрусь Архіпенка, Наталля Адамовіч, намеснік старшыні Бабруйскага райвыканкама Таццяна Варанко, старшыня Глушанскага сельсавета Марыя Сушчанка, аўтар бюста Генік Лойка, старшыня Магілёўскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Алесь Казека.

— Хачу выказаць словы ўдзячнасці ініцыятыўнай групе на чале з Андрусём Архіпенкам і яго маці Вандзе, якая вельмі дапамагла сыну рэалізаваць гэты і іншыя праекты, звязаныя з Глушай, — падкрэсліла падчас адкрыцця помніка **старшыня сельсавета Марыя СУШЧАНКА.**



Андрусь АРХІПЕНКА рэалізаваў у Глушы некалькі «адамовіцкіх» праектаў.

Андрусь, як мы пісалі раней, ужо рэалізуе на тэрыторыі трэці «адамовіцкі» праект — пасля прыпынку і бюста з'явіцца паказальнікі. Ну а праект бюста ён упершыню прапанаваў на кірмашы праектаў у 2017 годзе. Тады мала хто верыў, што такое наогул магчыма, але ўпарты хлопец на здаваўся — шукаў скульптара, збіраў подпісы ў падтрымку сваёй ідэі, каб у сваім звароце ў Міністэрства культуры аргументаваць, што помнік патрэбны. Дазвол быў атрыманы і ўзгоднены на ўсіх узроўнях. Неабходную суму сабралі за некалькі месяцаў. Каб паскорыць працэс, Андрусь арганізоўваў флэшмобы, чытанні, звяртаўся да вядомых публічных людзей, размяшчаў посты ў інтэрнэце.

— Рашэнне Андруся і яго таварышаў зрабіць помнік было для мяне адначасова і нечаканым, і прыемным, — прызналася Наталля Адамовіч. — Размовы пра стварэнне музея Алесю Адамовічу ў Глушы вяліся 25 гадоў, з таго моманту, як ён памёр. І безвынікова. Андрусь з сябрамі — першапраходцы. Прыпынак, які яны прысвяцілі бацьку, меў такі поспех, што пасля шмат хто такім чынам праславіў сваіх выдатных землякоў. А цяпер вось ёсць і помнік. Мне вельмі падабаецца, як яго зрабіў Генік Лойка. На вуснах усмешка, твар павернуты да роднага дома.



«Жывы» аўтограф ад Адамовіча.

Бацька, калі адчуваў, што жыць яму засталося зусім мала, прасіў пахаваць яго ў Глушы. Цяпер ён другі раз вярнуўся дадому.

Наталля не хавала слёз, калі адкрывалі помнік. Наогул хваляваліся ўсе. Генік Лойка згадаў гісторыю пра тое, што, калі ён вучыўся на артыста, якраз здымаўся фільм «Ідзі і глядзі», і ў яго была магчымасць сыграць Флёру. Але хлопец адмовіўся з-за таго, што тэкст трэба было вымаўляць на рускай мове. А вось цяпер, праз шмат гадоў пасля гэтага, зноў датыкнуўся да тэмы Адамовіча.

На адкрыцці помніка добрым словам згадалі сённяшняга **намесніка кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Андрэя КУНЦЭВІЧА.** Менавіта ён самы першы пералічыў грошы на створаны ў 2016 годзе разліковы рахунак па зборы сродкаў для вырабу праектна-каштарыснай дакументацыі і рэканструкцыі будынка ў пасёлку Глуша пад музей Алеся Адамовіча.

Свае віншаванні з нагоды адкрыцця помніка накіраваў і **генеральны дырэктар Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы Павел ЛАТУШКА.** «Мэтай жыцця Адамовіча была творчасць, пошук справядлівасці, — напісана ў пасланні. — Дзе б ён ні працаваў, ён заўсёды кіраваўся прынцыпам гістарызму і гуманізму. Абарона правоў пісьменнікаў, праўда пра Чарнобыль, грамадская і літаратурная дзейнасць зрабілі яго імя шырока вядомым. Творчасць Алеся Адамовіча жыве і на купалаўскай сцэне. У 2010 годзе ў тэатры быў пастаўлены спектакль паводле аповесці «Нямко». Бронзавы бюст сапраўднага беларускага інтэлігента — яшчэ адзін крок на шляху ўшанавання нашых нацыянальных традыцый».

## Праект музея

Музей у аптэцы — пакуль тэма будучыні, нешта прадказаць яшчэ цяжка. Але на стэндзе раённай бібліятэкі можна было ўбачыць архітэктурна-мастацкі праект экспазіцыі «Жыццё і творчасць Алеся Адамовіча» ў пасёлку Глуша.

— Праект зроблены з такім разлікам, што калі музей адкрыецца ў будынку аптэкі, мы яго зможам з лёгкасцю туды перанесці, — патлумачыла **намеснік старшыні Бабруйскага райвыканкама Таццяна ВАРАНКО.** — Менавіта такую задачу мы ставілі перад арганізацыяй, якая распрацоўвала праект. Яны прапанавалі варыянт, які мы ўзгаднілі з дачкой Алеся Адамовіча Наталляй і ініцыятыўнай групай Андруся Архіпенкі. Гэта пакуль папярэдні праект, у які мы можам уносіць карэктывы, рабіць акцэнт на любым этапе жыцця пісьменніка. Пад яго ўжо вызвалены музейныя пакоі ў Доме культуры, пры наяўнасці грошай за 3-4 месяцы праект можа быць рэалізаваны. Там жа ёсць памяшканне, дзе можна паказаць кінематаграфічную творчасць пісьменніка. Кінастудыя «Беларусьфільм» гатова аказаць нам дапамогу з тэматычным матэрыялам. На жаль, у нас няма жывых экспанатаў. Акцэнт зроблены на пано, мастацкіх стэндах. Паколькі тэма вайны праходзіць праз творчасць Адамовіча чырвонай ніткай, мы паклапоцімся аб наяўнасці мальбертаў, каб можна было арганізоўваць яшчэ і выстаўкі на гэтую тэму. Для раёна імя Алеся Адамовіча вельмі значнае, і мы ганарымся тым, што ў Глушы цяпер ёсць помнік яму. Гэта прыклад канструктыўнага супрацоўніцтва прыватнай ініцыятывы і дзяржавы.

**Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.**

Збор сродкаў на музей працягваецца. Далучыцца да добрай справы можаце і вы. Разліковы рахунак адкрыты пры **аддзеле ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Бабруйскага райвыканкама:**

**р/р BY84AKBB36421292723267 100000 у філіяле 703 «ААТ ААБ Беларусбанк», БІК AKBBBY21703, УНП 701226324.**

**Прызначэнне плацяжу: «Для вырабу праектна-каштарыснай дакументацыі і рэканструкцыі будынка ў пасёлку Глуша пад музей А. Адамовіча». Гэты доўгі сказ павінен быць пазначаны ў банкаўскім дакуменце абавязкова.**

Тым часам

# МЯСЦОВАЕ ПРЫЦЯГНЕННЕ

## На Гродзеншчыне ўстанавілі памятны знак акадэміку Карскаму

**Нячаста адкрываюцца памятныя знакі ў гонар дзеячаў беларускай навукі, культуры і мастацтва ў сельскай мясцовасці. Таму кожная такая падзея прыцягвае да сябе ўвагу людзей, незалежна ад іх прафесіі, поглядаў, веравызнання, прыналежнасці да той ці іншай грамадскай суполкі.**

Пра гэта падумалася на ўшанаванні памяці акадэміка, філолага-славіста, палеографа і энтографа, аўтара фундаментальнай навуковай працы «Беларусы» Яўхіма Карскага пад Гроднам.



Вядома, што месцам нараджэння славутага вучонага з'яўляецца вёска Лаша. Аднак у Гродзенскім раёне ёсць яшчэ адна мясціна, звязаная з імем Яўхіма Карскага. Гэта вёска Мігова, размешчаная на беразе Нёмана, непадалёк ад аэрапорта «Абухава».

Днямі тут адбылося ўрачыстае адкрыццё памятнага знака. Унізе мармуровай дошкі, прымацаванай да каменя, выгравіраваны ўрывак з успамінаў Яўхіма Карскага: «Летам 1901 г. мне давялося тры месяцы правесці ў маёнтку Мігова... гаворка тут чыста беларуская...»

Гэтыя словы, прачытаныя ў адной з кніжак, натхнілі гродзенскага краязнаўца Алеся Кроя ініцыяваць уключэнне вёскі Мігова, сваёй малой радзімы, у турыстычны маршрут «Прынёманскімі шляхамі Яўхіма Карскага» і распаўсюджванне адпаведнай карты. З розных крыніц ён даведаўся, што, аб'ехаўшы больш за сотню мястэчак і вёсак, Яўхім Карскі найчасцей праводзіў свой летні адпачынак тут. Яго праўнук Аляксандр Карскі тройчы згадваў Мігова ў працы аб геаграфіі месцаў пражывання і доўгіх прыпынкаў прадзеда з 1901 да 1907 года. Дачка акадэміка Наталля Баркоўская пісала: «Лета мы праводзілі на дачы пад Гроднам. Калі бацька не выязджаў у чарговую, часамі вельмі цяжкую і далёкую экспедыцыю па вывучэнні беларускіх гаворак, тады і на дачы пісаў свае працы».

На адкрыцці памятнага знака Алесь Крой выказаў падзяку многім людзям, якія дапамаглі ў яго ўсталяванні. Вялікую падтрымку ў арганізацыйных пытаннях аказаў старшыня Абухаўскага сельскага Савета Валерый Смалей. Пагрузачна-транспартныя работы ўзяў на сябе мясцовы сельскагаспадарчы вытворчы кааператыў імя І. Сянько. Не засталіся ўбаку жыхары вёскі Мігова і члены аднайменнага садовага таварыства. Без падмогі валанцёраў на ўвесь комплекс работ трэба было б сабраць яшчэ каля 10 тысяч рублёў.




Дарэчы, даўжыня шматтоннага каменя больш за 185 сантыметраў, шырыня да 140. Для такой глыбы, контуры якой, дарэчы, нагадваюць абрысы карты Беларусі, спецыялісты параілі будаваць моцны падмурак. А сам валун паставіць на пастамент, складзены з мноства малых камянёў, што сімвалізуюць тытанічную працу вучонага-даследчыка. Сам памятны знак з гранітнай плітой і надпісам на ёй быў адобраны Міністэрствам культуры.

**Тамара БАЎТРУКЕВІЧ. Фота аўтара.**

# Хлеб першы і другі

## Недахопу бульбы і грэчкі ў Беларусі не будзе

**Аграпрамысловы комплекс Беларусі практычна завяршыў сельскагаспадарчы год — і з лепшымі за леташнія паказчыкамі. Пра гэта паведаміў міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Анатоль ХАЦЬКО падчас прэс-канферэнцыі ў Нацыянальным прэс-цэнтры. Па словах кіраўніка галіны, даручэнне Прэзідэнта па зборы збожжа выканана — нарыхтавана каля дзевяці мільёнаў тон. Харчовая бяспека ў краіне забяспечана.**

Валавая вытворчасць сельскагаспадарчай прадукцыі па выніках года чакаецца на ўзроўні 102,8—103 працэнтаў, дынамічна нарошчваецца экспартны патэнцыял, працягваюцца дыверсіфікацыя экспарту і пашырэнне геаграфіі паставак.

Міністр звярнуў увагу і на поспехі жывёлагадоўлі. У прыватнасці, вытворчасць малака сёння складае каля 104 працэнтаў да ўзроўню мінулага года.

«Па ўсіх асноўных відах прадукцыі, неабходнай для нашай краіны, мы сябе на працягу апошніх гадоў забяспечваем. Што да бульбы, агародніны — па асобных пазіцыях павялічваем іх вытворчасць і рэалізуем на экспарт», — адзначыў Анатоль Хацько.

Беларускія аграрыі штогод рэалізуюць на экспарт каля трохсот тысяч тон бульбы. Сёлета гэта лічба будзе яшчэ большай. Ураджай «другога хлеба» чакаецца каля мільёна тон у грамадскім і фермерскім сектарах, а ўвогуле — не менш за шэсць мільёнаў тон.

«Сітуацыя з пастаўкамі ва Украіну, у Малдову — гэта рынак, нармальна, што мы забяспечваем і сябе, і суседзяў. Гэта адыграе ролю ў эканоміцы. У Расіі не ўрадзіла грэчка, што выклікае трывогу ў насельніцтва. Але ў нас цягам апошніх гадоў стабільная сітуацыя і з плошчамі, і са зборам грэчкі», — запэўніў міністр.

Ён таксама высока ацаніў супрацоўніцтва аграрыяў і вучоных, адзначыўшы цеснае ўзаемадзеянне па ўсіх пытаннях. Сярод апошніх сумесных дасягненняў — распрацоўка малочных заквасак, ветэрынарных прэпаратаў, новых тэхналогій, у тым ліку геномнай ацэнкі жывёлы.

«Мы мусім перасягнуць уяўную мяжу, ідэалогію: па-ранейшаму працаваць нельга, толькі праз тэхналогію, праз навуковыя распрацоўкі інавацыйнага плана. Аграрны сектар — гэта сёння рабатызаваная, аўтаматызаваная вытворчасць з самым сучасным абсталяваннем, дзе без ведаў і ўліку навуковых распрацовак мы не бачым перспектывы», — падкрэсліў Анатоль Хацько.

А перспектывы ёсць не толькі на ўласным рынку. Сёлета Беларусь адкрыла 11 новых імпарцёраў, сярод якіх Афганістан, Пакістан, Тайланд, Ангола, Бенін, Кенія, Куба. І практычна на ўсе рынкі збыту аб'ёмы паставак нарошчаныя. **Начальнік галоўнага ўпраўлення знешнеэканамічнай дзейнасці Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Аляксей БАГДАНАЎ** паведаміў, што аб'ём экспарту дасягнуў амаль чатырох мільярдаў долараў.

Аляксей Багданаў падкрэсліў, што, нягледзячы на высокія мытныя тарыфы ў Еўрапейскім саюзе, беларускія аграрыі здолелі павялічыць аб'ём экспарту ў гэты рэгіён на восем працэнтаў. Больш за ўсё беларускіх прадуктаў у Літве, Польшчы і Германіі.

**Варвара МАРОЗАВА.**

Ну і ну!

# ЗАПЁР ЖАНЧЫНУ Ў ВАЛЬЕРЫ

**Яна не прынесла спіртное і закуску.**

Такім чынам у Слоніме мужчына вырашыў пакараць прадстаўніцу слабага полу 1983 года нараджэння, мясцовую жыхарку, за тое, што разам з перададзенымі ёй грашыма на набыццё прадуктаў харчавання і алкаголю яна знікла амаль на суткі і вярнулася без нічога. Як паведамілі ў аддзяленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Гродзенскага аблвыканкама, напярэдадні кампанія адпачывала ў прыватным доме. Спіртное разам з закускай падыходзіла да канца, і адну з удзельніц застолля адправілі ў краму па пакупкі. Вярнулася яна толькі на наступны дзень. Найбольш раззлаваны з тых, хто чакаў, замкнуў жанчыну ў вальеры, сказаўшы, што адчыніць клетку праз 12 гадзін, але забыўся забраць у яе мабільны тэлефон. Менавіта пры яго дапамозе вязніца паведаміла ў органы ўнутраных спраў.

Праваахоўнікі, якія прыбылі на месца, устанавілі ўсе дэталі таго, што адбылося. Супрацьпраўным паводзінам нідзе не працуючага жыхара Слоніма 1981 года нараджэння дадзена прававая ацэнка.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ПАЖАР НА ЧАТЫРОХ КОЛАХ

## Натуральны знос і «кулібінства»

Любы аўтамабіль пасля ўзгарання абавязкова накіроўваецца на пажарна-тэхнічную экспертызу. Нават калі прычыны здарэння ляжаць, скажам так, не ў крымінальнай плоскасці, то ўсё роўна застаюцца тры пытанні: з-за чаго загарэўся аўтамабіль, хто нясе адказнасць і ці страхавы гэта выпадак? На коне нярэдка стаяць пяцізначныя сумы грошай.



— Самая распаўсюджаная прычына пажару ў аўтамабілях — гэта аварыйны рэжым работы электраабсталявання, — адзначае **начальнік аддзела механізму гарэння ўпраўлення пажарна-тэхнічных экспертыз Цэнтральнага апарату Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз Беларусі падпалкоўнік юстыцыі Расціслаў КУРСЕВІЧ.** — А што менавіта да яго прывяло — тут ужо могуць быць розныя варыянты. Мы не раз сутыкаліся з тым, што ў электрычную схему падключаюцца прыборы, якія не былі прадугледжаны заводам-вытворцам. Гэта больш магутнае асвятленне, акустычныя ўзмацняльнікі, няправільна падабраныя магнітолы і нават падагравальнікі. Часам само гэта абсталяванне падключана няправільна — без устаноўкі дадатковых засцерагальнікаў, пры дапамозе скрутка правадоў, у якіх пакрысе ідуць працэсы акіслення. Узнікае вялікае пераходнае супраціўленне. У лепшым выпадку ланцуг абарвецца, і тады ўсё скончыцца толькі рамонтам электраправодкі. Але гэта, можна сказаць, яшчэ пашанцуе. Бо з такой жа доляй верагоднасці ў зоне кантакту можа пачацца лакальны разагрэў. Далей праводка плавіцца і адбываецца кароткае замыканне. А штатныя засцерагальнікі, якія маглі б абясточыць ланцуг своечасова, былі дэмантаваныя — інакш з імі дадатковае абсталяванне не змагло б працаваць.

Узімку праблем дадаюць прычапныя разеткі. Па сутнасці — гэта вывад сілавых і сігнальных праваднікоў для таго, каб на прычэпе таксама працавалі ўсе агні. Але праваднікі гэта агаленыя і да таго ж размешчаныя на маленькай пляцоўцы. І вось калі аўто рухаецца па дарозе, шчодра пасыпанай салевай сумессю, то кампаненты апошняй разлятаюцца ва ўсе бакі. У тым ліку — і ў разетку, калі яна не закрыта спецыяльнай заглушкай. На кантактах пачынае асядаць соль, якая з цягам часу высыхае. Электрычнасць яна праводзіць цудоўна, і да кароткага замыкання тут застаецца літаральна паўкроку.

— Калі мы кажам пра аўтамабіль бюджэтнай катэгорыі, то не варта чакаць абсалютна такога ж электраабсталявання ў ім, як у машыне прэміум-сегмента па кошце кватэры ў сталіцы, — працягвае судовы эксперт. — Дзесьці будуць таннейшыя правады, ізаляцыя, кантакты... Натуральна, пакуль аўтамабіль эксплуатуецца так, як належыць, то вялікіх праблем з ім не ўзнікае. Але трэба памятаць: любое злучэнне ў машыне, праз якое праходзіць істотная электранагрузка, — гэта патэнцыйнае месца ўзнікнення вялікага пераходнага супраціўлення. І не ляніцеся вывучаць тэматычныя сайты ў інтэрнэце. Як правіла, на іх апісаны «хваробы» для ўсіх папулярных марак. Напрыклад, скрутак правадоў праведзены праз металічныя канструкцыі, і за 10—15 гадоў эксплуатацыі там з натуральных прычын перацёрцца ахоўны кажух. Але зноў жа, калі не ўносілася ніякіх змен у электрычную схему, то засцерагальнікі выратуюць. А адрамантаваць праводку куды танней, чым купіць пасля пажару новы аўтамабіль.

Саматужны рамонт таксама можа мець дрэнныя наступствы. Напрыклад, у маторным адсеку праведзены сілавыя ланцугі стартара і генератара. Яны не знаходзяцца пад аховай засцерагальнікаў, бо праз іх працякаюць вельмі магутныя токі. І вось мы неаднойчы бачылі, што пры саматойным рамонце, калі здымалі і ставілі назад гэтыя агрэгаты, правады мацаваліся не так, як яны ішлі раней. У выніку яны або перацiраліся з-за вібрацыі, або дакраналіся да моцна нагрэтых элементаў выпускнога калектара. На некаторых яго элементах тэмпература можа дасягаць 700 градусаў! Далей усё па класіцы — кароткае замыканне, засцерагальнік у парушанай электрычнай схеме нармальна не спрацаваў, пажар. Дарэчы, былі ў нас даследаванні, падчас якіх высвятлялася, што прычына пажару палягала ў няспраўнай сістэме ахалоджвання. Па кроплі вадкасць трапляла на выпускны калектар. Вада выпаралася, а вось этыленгліколь заставаўся. Тэмпература яго кіпення складае каля 200 градусаў. У нейкі момант адбывалася ўспышка...

## Прычыны могуць быць і ў шынах

— Была ў нас вельмі цікавая экспертыза велікагрузнага аўтамабіля, — згадвае Расціслаў Курсевіч. — Ехала фура з півам, у якой адна з падушак на пнеўматычнай падвесцы перастала трымаць ціск. Платформа нахілілася на кола. «Дапамог» яшчэ і моцны бакавы вецер. Шына пачала чапляць за металічны болт, які выступаў з падлогі грузавога адсека. Болт моцна разагрэўся, і ад яго пачало тлець пакрыццё падлогі. Гарэнне перайшло ўнутр, проста на кардонныя каробкі, а пасля перакінулася на тэнт. Толькі тады кіроўцы, якія ехалі ззаду, пачалі сігналіць, бо раней агню бачна не было зусім...

Але дрэнны стан саміх шын можа таксама стаць прычынай пажару. Калі вы едзеце з прыспушчанай шынай, то слаі гумы разыходзяцца. Яны пачынаюць паміж сабой церціся. Працэс ідзе лавінападобна, паколькі ўтвараецца яшчэ большая колькасць цяпла. У лепшым выпадку кола проста разбурыцца. Але здараецца і так, што пачынае ўтварацца дым.

Як бачым, загарэцца ў аўтамабілі ёсць шмат чаму. Але пазбегнуць гэтага даволі проста — трэба своечасова праходзіць тэхагляд і клапаціцца аб здароўі свайго «жалезнага каня». Тады і тэхніка «аддзячыць» доўгай і надзейнай работай.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)

**Сведения о проведении рекламной игры «Есть перерыв – есть КІТКАТ!»**

**Организатор рекламной игры –** ООО «Пиар Куб», место нахождения: 220030, г. Минск, ул. Ленина, д. 50, 5-й этаж, оф. пом. 1, УНП 192452588; электронный адрес: info@igrakitkat.by.

**Наименование рекламной игры:** «Есть перерыв – есть КІТКАТ!».

**Сведения о государственной регистрации рекламной игры:** рекламная игра зарегистрирована 27 августа 2019 года Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь, Свидетельство о регистрации рекламной игры № 3627.

Срок начала и окончания рекламной игры, включая срок выдачи выигрышей и опубликования результатов проведения рекламной игры: со 2 сентября 2019 г. по 15 ноября 2019 г.

В рекламной игре приняли участие 825 участников.

Призовой фонд разыгран полностью.

*Сведения о Победителях рекламной игры с указанием их выигрышей размещены на интернет-сайте https://vitalur.by/kitkat/*

Телефон для справок по вопросам проведения рекламной игры: +375296326100. Режим работы телефона для справок: в течение срока проведения Рекламной игры с 09.00 до 21.00 ПН–ПТ, с 10.00 до 18.00 СБ–ВС.

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА Инспекции Министерства по налогам и сборам Республики Беларусь по Березовскому району**

**Предмет аукциона:** легковой автомобиль ШЕВРОЛЕ АВЕО, тип – легковой седан, год выпуска – 2008-й, кузов № KL1SF697J8W012947.

**Местонахождение предмета торгов:** Брестская обл., г. Береза, ул. 17 Сентября, 33.

| Начальная цена, руб. (без учета НДС) | 1 854,50 | Размер задатка, руб. | 185,45 |
|---|---|---|---|

**Продавец:** Инспекция Министерства по налогам и сборам Республики Беларусь по Березовскому району, Брестская обл., г. Береза, ул. 17 Сентября, 33, тел./факс 2 42 03.

**Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки».

**Реквизиты для перечисления задатка:** BY76BPSB30121789380179330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», Региональная дирекция №100 по Брестской области, BIC Банка BPSBBY2X, УНП 201028245.

**Условия продажи:** без условий.

**Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 5 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

**Условия оплаты:** в соответствии с заключенным договором купли-продажи.

**Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, оплачивает возмещение затрат, а также вознаграждение Организатору аукциона в течение 3 рабочих дней со дня подписания протокола аукциона

**Аукцион состоится 16 декабря 2019 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, а также иную информацию можно узнать у организатора аукциона по телефонам 8-(0162)-20-92-13, 21-88-81, 8-(029) 626-72-52

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00

**Последний день приема заявлений – 13 декабря 2019 г. до 17.00**

**Вниманию предприятий, организаций и индивидуальных предпринимателей!**

*Комитетом государственного имущества Гродненского областного исполнительного комитета проводятся аукционы по продаже неиспользуемого имущества, находящегося в собственности Волковысского района:*

К ПРОДАЖЕ ПРЕДЛАГАЕТСЯ:

1. Комплекс зданий и сооружений цеха по производству красного кирпича по улице Осипенко, 21, 21/1-21-3, 21/8, 21/11-21/14 в городе Волковыске.

**Начальная цена предмета аукциона – 29 базовых величин, размер задатка – 1 базовая величина.**

**Аукцион состоится 28 ноября 2019 года в 12.00.**

Заявки на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39.

**Последний день подачи заявлений на участие в аукционах – 22 ноября 2019 г. до 17.00.**

Подробная информация по телефонам: в городе Волковыске 8 (01512) 4 50 25, 2 07 46; в городе Гродно – 8 (0152) 77 29 15, 72 25 18, 72 21 02.

Сайты: **www.region.grodno.by**, gki.gov.by

УНП 500042135

**В извещении о повторном открытом аукционе № 61/19, опубликованном в газете «Звязда» 02.11.19 и объявленном на 20.11.2019, правильным считать:**

Срок подписания договора купли-продажи предмета аукциона – в течение 20 дней со дня проведения аукциона. Срок оплаты предмета аукциона по договору купли-продажи – в течение 60 дней со дня проведения аукциона, если стороны договора не договорятся об ином сроке.

УНП 191302068

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении повторного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Вишневка-2010» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже недвижимого имущества в составе:

**Лот № 1 (повторный): коровник** с инв. № 600/С-128546 общей площадью **875,0 кв. м;**

**коровник (пункт искусственного осеменения)** *(составные части и принадлежности: пристройка)* с инв. № 600/С-128638 общей площадью **839,1 кв. м;**

**зерносклад** с инв. № 600/С-129046 общей площадью **298,6 кв. м;**

**навозохранилище (сооружение)** с инв. № 600/С-128636, площадь застройки – **1396 кв. м.**

Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером **623688200001000493** площадью **1,9102 га** (право постоянного пользования) по адресу: **Минский район, Юзуфовский с/с, район д. Лусково.** *На земельном участке имеются ограничения прав в использовании: охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 вольт, площадью 0,1016 га; охранная зона электрических сетей напряжением свыше 100 вольт, площадью 0,2469 га.*

Начальная цена объектов с НДС (20 %) **– 287 136,00 бел. руб.** *Цена снижена на 20 %.* Задаток 10 % от начальной цены **– 28 713,60 бел. руб.**

**Лот № 2: навес для с/х машин реммехсектора,** инв. № 600/С-128536, площадь застройки – **890 кв. м.** Объект расположен на земельном участке с кадастровым номером **623688200001000516** площадью **0,6834 га** (право постоянного пользования) по адресу: **Минский район, Юзуфовский с/с, район д. Угляны.** *На земельном участке имеются ограничения прав в использовании: охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 вольт, площадью 0,0150 га.*

Начальная цена объекта с НДС (20 %) **– 137 169,79 бел. руб.** Задаток 10 % от начальной цены **– 13 717,00 бел. руб.**

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона в следующем размере: 3 (трех) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона.

**Задаток перечисляется на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, г. Минск, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. По лоту № 1 предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 05.09.2019. Аукцион по лоту № 1 состоится **25.11.2019** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **22.11.2019** до **16.00** по указанному адресу. Аукцион по лоту № 2 состоится **16.12.2019** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **13.12.2019** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**

## Извещение о проведении аукциона

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАСО «Би энд Би иншуренс Ко», г. Минск, ул. Я. Коласа, 38 |

**Предмет аукциона**

| № лота | Наименование |
|---|---|
| 1 | **Исключительное право (в полном объеме на весь срок действия авторского права) на программное обеспечение – система по учету страховой деятельности «Страховой офис»** |
| | **Начальная цена (с НДС 20 %): 424 800, 00 бел. руб. Шаг аукциона: 21 240,00 бел. руб.** |
| | **Краткое описание лота:** программное обеспечение – система по учету страховой деятельности «Страховой офис» позволяет вести учет страховой деятельности страховой компании, включая учет клиентов, договоров страхования и перестрахования, взносов, страховых случаев и выплат по ним, а также претензионную работу, расчет страховых резервов, блок аналитической отчетности. С более подробным техническим описанием программного обеспечения можно ознакомиться на сайте **www.cpo.by** |
| 2 | **Автомобиль «Мерседес-Бенц» SL 500 (легковой кабриолет, рег. знак 9717 ЕС-7, 2002 года выпуска)** |
| | **Начальная цена (с НДС 20 %): 19 701,86 бел. руб. Шаг аукциона: 985,09 бел. руб.** |
| 3 | **Автомобиль «Пежо Партнер» (легковой специальный универсал, рег. знак 9616 ВТ-7, 2006 года выпуска)** |
| | **Начальная цена (с НДС 20 %): 2 778,47 бел. руб. Шаг аукциона: 138,92 бел. руб.** |

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, в том числе документ, подтверждающий внесение задатка с отметкой банка, в размере 10 % от начальной цены предмета аукциона, зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **www.cpo.by**

В случае регистрации на аукцион одного участника предмет аукциона может быть продан данному участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора уступки исключительных прав (по лоту № 1) / договора купли-продажи (по лотам №№ 2, 3)** | **5 (пять) рабочих дней** после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона:** Предмет аукциона должен быть оплачен покупателем в течение **10 (десяти) рабочих дней со дня проведения аукциона**

Победитель аукциона либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона, а также оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере 4 (четырех) процентов от цены продажи предмета аукциона в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения аукциона

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **16.12.2019** в 12.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **13.12.2019** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»** |
| **Контакты** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06. E-mail: auction@ipmconsult.by** |

**ОАО «ЦентроСтройОфис» проводит внеочередное общее собрание акционеров ОАО «ЦентроСтройОфис» в очной форме 25 ноября 2019 года в 13.00. Место проведения собрания: ОАО «ЦентоСтройОфис», г. Минск, ул. Монтажников, 39, к. 208.**

ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:

1. О Сделках общества.

Регистрация лиц, имеющих право на участие в собрании, будет проводиться в день проведения собрания с 12.00 до 12.45 по адресу: ОАО «ЦентроСтройОфис», г. Минск, ул. Монтажников, 39, к. 208.

Участники собрания должны иметь при себе документ, удостоверяющий личность (представители акционера – документ, удостоверяющий личность, и доверенность).

Дата составления списка владельцев ценных бумаг для регистрации участников собрания по состоянию реестра акционеров на 18.11.2019 г.

Время и место ознакомления лиц, имеющих право на участие в собрании, с материалами по вопросам повестки дня общего собрания: с 9.00 до 9.30, в рабочие дни с 15.11.2019 г. по 25.11.2019 г. по адресу: ОАО «ЦентроСтройОфис», г. Минск, ул. Монтажников, 39, к. 208.

УНП 191303207

## Извещение о проведении аукциона

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, д. 5, корп. 2, пом. 1703, оф. 5 |
| **Продавец** | Смолевичское райпо, Минская обл., г. Смолевичи, ул. Советская, д. 133 |

**Предмет аукциона**

Месторасположение**: Минская обл., Смолевичский р-н, г. Смолевичи**

| Наименование | Общая площадь | Инвентарный номер | Адрес |
|---|---|---|---|
| **Лот № 1** | | | |
| **Магазин № 13** | 192 кв. м | 614/С-19403 | **ул. Минская** |
| Составные части и принадлежности: сарай | | | |
| ***Сведения о земельном участке:*** предоставлен Продавцу на праве аренды (срок действия по 07.01.2048), общ. пл. **0,0912** га, для обслуживания здания магазина № 13. Ограничения (обременения): охранная зона электрических сетей до 1000 вольт (пл. 0,0064 га) | | | |
| **Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 52 800,00 бел. руб.** | | | |
| **Лот № 2** | | | |
| **Магазин № 30** | 231,6 кв. м | 614/С-19091 | **ул. Песчаная, д. 5** |
| Составные части и принадлежности: тамбур | | | |
| ***Сведения о земельном участке:*** предоставлен Продавцу на праве аренды (срок действия по 29.07.2069), общ. пл. **0,1908** га, для обслуживания здания магазина № 30 | | | |
| **Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 66 705,80 бел. руб.** | | | |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **30** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

50 % от цены продажи предмета аукциона оплачиваются в течение 5 банковских дней с момента подписания протокола о результатах открытого аукциона (для снятия запрета, установленного ОПИ), оставшаяся сумма с учетом ранее внесенного задатка оплачивается в течение 1 (одного) месяца после подписания договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

**Аукцион состоится 17.12.2019** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и **необходимые документы принимаются по 16.12.2019** до 17.00 по указанному адресу. Тел.: +375 17 280-36-37; 8029-317-95-42. www.cpo.by**. E-mail: auction@cpo.by**

## ООО «Облмехотряд» в лице ликвидатора ООО «Юридическая группа «СОВЕТНИК» проводит повторные торги по продаже имущества предприятия

**Продавец:** ООО «Облмехотряд» в лице ликвидатора ООО «Юридическая группа «СОВЕТНИК».

**Организатор торгов:** РУП «Информационный центр Министерства экономики Республики Беларусь», 220030, г. Минск, ул. Берсона, 1А, ком. 513. Руководитель организатора электронных торгов – Вашемирский Максим Петрович; тел. 200-64-11, тел./факс: 200-95-63, 200-73-33, https://torgi.gov.by/.

Публичные торги в электронной форме в процедуре ликвидации (далее – электронные торги) будут проведены: 27 ноября 2019 г. в 8.00, на электронной торговой площадке https://torgi.gov.by/, окончание – 27 ноября 2019 г., 16.00.

**Заявки принимаются с 13 ноября 2019 г. по 26 ноября 2019 г. включительно.**

Шаг аукциона 5 %.

**Для участия в торгах необходимо:**

1. Перечислить задаток по выбранному лоту в размере 5 % от начальной цены.
2. Подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте https://torgi.gov.by/.

Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат на организацию и проведение торгов в течение 5 рабочих дней со дня их проведения на основании представленного организатором торгов либо продавцом извещения о возмещении затрат.

**Срок заключения договора купли-продажи:** не позднее 7 рабочих дней со дня проведения торгов.

**Срок оплаты предмета торгов:** не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Более подробная информация о проведении торгов на сайте https://torgi.gov.by/.

| № лота | Предмет торгов | Местонахождение | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС | Шаг торгов (5 %), бел. руб. | Сумма задатка (5 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | GAZ A22R23, инв. № 145 | Копыльский район, д. Новоселки, ул. Жижика, 68 | 15 936,00 | 796,80 | 796,80 |
| 2 | картофелеуборочный комбайн DR1500 GRIMME 06, инв. № 62 | Копыльский район, д. Новоселки, ул. Жижика, 68 | 33 984,00 | 1699,20 | 1699,20 |
| 3 | трактор «Беларус» 82.1, инв. № 130 | Копыльский район, д. Новоселки, ул. Жижика, 68 | 16 512,00 | 825,60 | 825,60 |
| 4 | трактор «Беларус» 82.1, инв. № 131 | Копыльский район, д. Новоселки, ул. Жижика, 68 | 18 720,00 | 936,00 | 936,00 |
| 5 | опрыскиватель 600L 12M, инв. № 138 | Копыльский район, д. Новоселки, ул. Жижика, 68 | 1344,00 | 67,20 | 67,20 |
| 6 | ПТС-7, инв. № 115 | Копыльский район, д. Новоселки, ул. Жижика, 68 | 2784,00 | 139,20 | 139,20 |
| 7 | ПКК-1-0100000 измельчитель, инв. № 126 | Копыльский район, д. Новоселки, ул. Жижика, 68 | 1056,00 | 52,80 | 52,80 |
| 8 | ПКК 0350000 подборщик, инв. № 148 | Копыльский район, д. Новоселки, ул. Жижика, 68 | 1920,00 | 96,00 | 96,00 |
| 9 | агрегат АДД-4004 МУ, инв. № 49 | Копыльский район, д. Новоселки, ул. Жижика, 68 | 2784,00 | 139,20 | 139,20 |
| 10 | плуг полунавесной ППО-(4+1)-40К3, инв. № 118 | Копыльский район, д. Новоселки, ул. Жижика, 68 | 4320, 00 | 216,00 | 216,00 |
| 11 | грабли роторные ГР-700, инв. № 128 | Копыльский район, д. Новоселки, ул. Жижика, 68 | 7296,00 | 364,80 | 364,80 |
| 12 | машина для формирования гребней MR20, инв. № 7 | Копыльский район, д. Новоселки, ул. Жижика, 68 | 1728,00 | 86,40 | 86,40 |
| 13 | окучник-культиватор-гребнеобразователь ОКГ– 4,0, инв. № 104 | Копыльский район, д. Новоселки, ул. Жижика, 68 | 2304,00 | 115,20 | 115,20 |
| 14 | ПКК-0400000А-01 жатка для трав, инв. № 149 | Копыльский район, д. Новоселки, ул. Жижика, 68 | 6816,00 | 340,80 | 340,80 |
| 15 | пресс-подборщик рулонный ПР-Ф-180, инв. № 142 | Копыльский район, д. Новоселки, ул. Жижика, 68 | 8640,00 | 432,00 | 432,00 |
| 16 | пресс-подборщик рулонный ПР-Ф-180, инв. № 141 | Копыльский район, д. Новоселки, ул. Жижика, 68 | 8640,00 | 432,00 | 432,00 |
— Вельмі радасна бачыць знаёмыя твары — і супрацоўнікаў хоспіса, і тых, з кім мы сталі «сябрамі па няшчасці», — кажа мама Маргарыты Наталля. — Наша знаёмства пачалося 10 гадоў таму. Хоспіс — тая адзіная арганізацыя, якая суправаджала нас з самых першых дзён. Мы карыстаемся многімі яе паслугамі. Гэта найперш медыцынскія праграмы. Нам дапамагаюць расходнымі матэрыяламі, гастрастомамі, сурвэткамі, лекамі. Гэта і праграма сацыяльнай перадышкі, калі дзіця можна пакінуць у стацыянары, і яно атрымае прафесійны догляд, а самому падлячыцца ў бальніцы ці паехаць па справах. Для нас вельмі важная праграма летняга адпачынку ў лагеры «Бусел», куды на два тыдні ў год мы прыязджаем усёй сям'ёй. Такіх цяжкіх дзяцей больш нікуды не прымаюць — ні ў санаторыі, ні ў аздараўленчыя лагеры, таму гэта выйсце для нас.



### Такое не забываецца

Людміла Іванаўна Цыганова — медсястра, у хоспісе адпрацавала 25 гадоў. Зусім нядаўна выйшла на заслужаны адпачынак. Жанчына падзялілася асаблівасцямі няпростай работы ў хоспісе.

— Такое ніколі не забудзецца. Бо кожны дзень быў непадобны на папярэдні, а часам здараліся і бяссонныя ночы, калі перажываеш за дзіця. Я працавала з моманту адкрыцця хоспіса Ганнай Георгіеўнай. Спачатку была адзінай на ўсю ўстанову медсястрой. Вучылася сама і мяне вучылі, пасля ўжо я перадавала свой вопыт многім. Мне дагэтуль тэлефануюць мае «старыя» пацыенты, мы з імі сустракаемся. Як ні дзіўна, мяне ўсе памятаюць. Гэта дорага каштуе, калі цябе ўспамінаюць добрым словам. Спачатку я запісвала імёны ўсіх сваіх пацыентаў, потым кінула гэта: адчула, што яны ўсе ў маёй памяці, што б ні здарылася, яны ўсе ўсё роўна са мной. Я ўвесь горад ведаю па тых месцах, дзе жывуць «мае» дзеці, а з камандай мы аб'ездзілі ўсю Беларусь. Самае прыемнае — калі на такіх сустрэчах цябе рады бачыць. Дзеці, нават хворыя, адчуваюць, як ты да іх ставішся. Калі ёсць нейкі фальш, яны не прымуць цябе. Таму ў рабоце важная шчырасць, тут нельга схлусіць.

Дарэчы, калектыў хоспіса зрабіў асабісты падарунак Ганне Гарчаковай, па праве назваўшы яе «Калумбам дзіцячага паліятыву ў Беларусі». Ім стаў сімвал паліятыўнай дапамогі ва ўсім свеце — смоўж, які мае панцыр, а таму лічыцца, што ён ніколі не памірае. Упрыгожанне ручной работы выканана з серабра з камянямі цыркону.

Сёлета за актыўную дзейнасць у гуманітарнай сферы, сцвярджэнне ідэй чалавекалюбства і міласэрнасці, за ўклад у стварэнне нацыянальнай сістэмы дзіцячай паліятыўнай медыцынскай дапамогі, будаўніцтва на дабрачыннай аснове і арганізацыю работы Беларускага дзіцячага хоспіса калектыў удастоены прэміі «За духоўнае адраджэнне».

— Для гісторыі 25 гадоў — імгненне. Але мы пражылі яго правільна. Пераадольвалі цяжкасці, спазнавалі штосьці новае. Дзякуй нашым спонсарам — у нас у краіне вельмі шмат шчодрых, нераўнадушных людзей. Дзякуй нашым валанцёрам і замежным сябрам, якія вучылі і дапамагалі, — рэзюмавала **старшыня Апякунскага савета Беларускага дзіцячага хоспіса Вольга КАБЯКОВА.**

Свята завяршылася, несумненна, пакінуўшы цёплыя ўспаміны ў дзяцей і сяброў дзіцячага хоспіса. І ўжо сёння яго супрацоўнікі на сваіх месцах — там, дзе камусьці нашмат цяжэй, чым многім з нас, там, дзе тэрмінова патрабуецца іх веды, вопыт і прафесіяналізм.

**Алена КРАВЕЦ.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**

# ЗАПАС ТРЫВАЛАСЦІ «МУРАВЫ»




## У гаспадарцы, дзе развіваюць вытворчасць, разлічваюць на ўласныя сілы і жывуць па сродках

**Напярэдадні свята працаўнікоў сельскай гаспадаркі мы накіраваліся ў Мураву, каб пагаварыць з чалавекам, які ўсё жыццё прысвяціў хлебаробскай справе. Больш за трыццаць гадоў Пётр Білецкі ўзначальвае ААТ «Мурава». Па цяперашніх мерках гэта зусім невялікая гаспадарка, па плошчы далёкая ад сучасных гігантаў галіны. Але прадпрыемства трывала стаіць на нагах, устойліва развіваецца, людзі атрымліваюць прыстойную зарплату, бачаць перспектыву, маюць магчымасць паляпшаць свае жыллёвыя ўмовы. Вёскі, якія ўваходзяць у склад ААТ, выглядаюць па-сучаснаму.**

### ФІНАНСЫ, ТЭХНАЛОГІІ, КАДРЫ

Дырэктар «Муравы» Пётр БІЛЕЦКІ разважае пра змены, якія адбываліся на працягу чатырох дзесяцігоддзяў яго працоўнай дзейнасці:

— З той пары змянілася ўсё ў сельскагаспадарчай вытворчасці. На службу чалавеку прыйшлі новыя тэхніка і тэхналогіі. Вачыма сучаснага аграрыя не проста цяжкай — ледзь не катаржнай працай выглядае тагачасная ўборка і апрацоўка лёну альбо нават нарыхтоўка кармоў. Менш за паўстагоддзя таму гэтая работа патрабавала шмат чалавечай сілы, а цяпер усё робяць машыны і трактары. І на ферме работа стала зусім іншай — не скажу, што лёгкай, але іншай. Там пануюць новыя тэхналогіі ўтрымання статку. Зноў жа на службу чалавеку прыйшла тэхніка.

Ну а калгасны машынна-трактарны парк XXI стагоддзя мае ўмовай наяўнасць адукаваных кіроўцаў, бо высокапрадукцыйная тэхніка ў асноўным камп'ютарызаваная. Але ж нязменным застаецца адно — сумленнасць працаўніка, шчырасць у адносінах да зямлі. Бо яе, зямлю, не падманеш. Недзе не дагледзеў, прапусціў, махнуў рукой — потым яно абавязкова вылезе, і не толькі стратай ураджаю ў канкрэтны сезон, але і пазней: агрэхі ў тэхналогіі пацягнуць за сабой цэлы ланцужок праблем. А на выпраўленне памылкі спатрэбіцца ўжо не адзін сезон, а, магчыма, некалькі.

І яшчэ ў чым пераканаўся за многія гады на ўласным вопыце, — працягвае Пётр Мікалаевіч, — у важнасці дакладнага фінансавага разліку і жыцця па сродках. Асабліва цяпер, ва ўмовах рынкавай эканомікі, павелічэння тэмпаў жыцця наогул. Усё варта загадзя пралічыць, каб не трапіць у фінансавую кабалу, і гэта з'яўляецца гарантыяй эканамічнага дабрабыту і стабільнасці. Мы заўсёды разлічваем толькі на ўласныя сілы, таму ніколі не мелі запазычанасці па выплаце заработнай платы і пагашэнні крэдытаў. Бяром крэдыт толькі тады, калі дакладна праглядаюцца механізмы і магчымасці яго пагашэння.

Спецыялізацыю нашай гаспадаркі можна вызначыць так: вытворчасць элітнага насення збожжавых культур, цукровых буракоў, алейнага насення, рапсу, малака. Але ўсё пералічанае не з'яўляецца догмай. Мы стараемся рабіць сваю гаспадарку дынамічнай, дакладна рэагаваць на патрабаванні рынку, укараняць новыя тэхналогіі, развіваць новыя вытворчасці. Ізноў вяртаюся да пытання тэхналагічнай дысцыпліны, бо пра гэта гаворым на ўсіх нарадах, сходах і ў штодзённай рабоце. Невыкананне, нават недакладнае выкананне распарадку — асноўная прычына недаатрымання прадукцыі і, адпаведна, даходу ад гаспадарчай дзейнасці. Гэта паўплывае на наш агульны дабрабыт. Любая вясковая гаспадыня ведае, што малако ў каровы на языку. Што ўжо казаць пра вытворчасць элітнага насення! Тут не проста важным, а, бывае, лёсаносным аказваецца кожны агранамічны нюанс. І сёння я ганаруся тым, што гэта разумеюць усе — ад галоўнага спецыяліста да механізатара. Не раз у полі даводзілася назіраць, як вопытныя механізатары паказваюць сваім маладзейшым таварышам, як правільна ўзараць, пасеяць альбо выканаць іншую тэхналагічную аперацыю.

***— У вас, відаць, часта пыталі маладыя калегі, як лепш весці гаспадарку. Што вы ім найперш раіце?***

— Раю знайсці аптымальны баланс фінансавых выдаткаў. І нават пры крытычным недахопе сродкаў не спыняць вытворчы працэс, а дабівацца павышэння якасці работы і яе прыбытковасці. Апошняе шмат у чым залежыць і ад нефінансавых фактараў, напрыклад, працоўнай дысцыпліны, прафесіяналізму, зацікаўленасці работнікаў. Варта яшчэ сказаць пра своечасовае пагашэнне даўгоў. Іх нельга назапашваць. Пратэрмінаваная запазычанасць перад пастаўшчыкамі, іншымі крэдыторамі наносіць урон іміджу прадпрыемства і перашкаджае далейшаму супрацоўніцтву. Таму важна, каб у кожнай гаспадарцы быў свой запас трываласці. Найперш, вядома, гэта фінансавыя сродкі. Але не менш важным бачыцца запас нематэрыяльных рэсурсаў — кадравы патэнцыял, дзелавы аўтарытэт, уласная ініцыятыўнасць, крэатыўнае мысленне.

***— Вось мы і падышлі да краевугольнага кадравага пытання. Нярэдка вясковы школьнік падыходзіць да апошняга званка са сфарміраваным стэрэатыпам, што недзе лепш і хутчэй можна зарабіць грошы на ўласны дабрабыт. Як жа заахвоціць моладзь заставацца дома?***

— Заўсёды на першым месцы ў справе замацавання моладзі была заработная плата. Але сёння гэта далёка не адзіны аргумент. Важна, каб малады чалавек ведаў, што ён будзе мець свой законны выхадны для ўласных спраў, каб была перспектыва атрымання жылля. І яшчэ: за доўгія гады ўпэўніўся, што прафарыентацыя мае вялікае значэнне. Бачыцца важным, каб пачынаючы з маленства дзеці ведалі і разумелі, чым займаюцца бацькі, які вынік мае іх праца. Важна паказваць моладзі і перавагі сельскай працы, а яны, несумненна, ёсць, нягледзячы на ўмовы, якія адрозніваюцца ад гарадскіх. Калі малады чалавек асэнсавана прыходзіць на работу, у яго ёсць матывацыя, імкненне да развіцця, гэта дае свае вынікі. У нас такіх працоўных дынастый, на шчасце, нямала. З іх складаецца касцяк прадпрыемства.

***— То-бок асноўным было і застаецца пытанне будаўніцтва жылля.***

— Вядома. Кадравая палітыка любога сельскагаспадарчага прадпрыемства пачынаецца з жыллёвай праграмы. Сённяшні спецыяліст, работнік, зацікаўлены ў атрыманні добраўпарадкаванага, камфортнага, энергаэфектыўнага жылля. І гэта справядлівае патрабаванне.

За час існавання дзяржаўнай праграмы крэдытавання будаўніцтва жылля на вёсцы мы ўзвялі каля 90 аднакватэрных дамоў. Ужо восем гадоў будуем энергаэфектыўныя каркасна-шчытавыя дамы. На жаль, апошнім часам на такое будаўніцтва не хапае фінансаў. І мы знайшлі больш танны варыянт. Купляем дамы на другасным рынку, праводзім іх капітальны рамонт з усімі сучаснымі элементамі добраўпарадкавання. Такіх навасёлаў маем ужо некалькі. Людзі не наракаюць, яны атрымліваюць дом з усімі выгодамі на абжытай вуліцы, з усталяванай інфраструктурай.



На бураковай плантацыі. Кіроўца пагрузчыка Уладзімір РУДЧЫК, аграном па ахове раслін Сяргей СЦЯПАНАЎ, кіроўцы грузавых аўтамабіляў Аляксей МАСЛЕНІКАЎ, Аляксандр ЦЭБРУК.




Пагрузка ўраджаю для перавозкі на цукровы завод.



Дырэктар акцыянернага таварыства Пётр БІЛЕЦКІ *(на фота ў цэнтры)* — удзельнік і заўзятар усіх мясцовых спартыўных спаборніцтваў. На гэтым фотаздымку ён разам з аматарамі спорту загадчыкам рамонтных майстэрняў Віталіем БЕРАЗНЮКОМ і начальнікам мехатрада Аляксандрам КАРУНАСАМ каля стэнда, дзе захоўваюцца ўзнагароды вясковых спартсменаў.



Асенняе ворыва. Палеткі, на якіх падымуцца збожжавыя культуры, аглядаюць механізатар Анатоль САВІЦКІ і галоўны інжынер Юрый ЛАШКЕВІЧ.

### БУСЕЛ НАД ДАХАМ

На такой вось людной вуліцы рыхтуецца да здачы дом Аляксея Масленікава. Аляксей — кіроўца. У «Мураве» таксама працуюць і яго бацькі. Тут хлопец скончыў школу, затым адслужыў у войску і пасля дэмабілізацыі тры гады адпрацаваў у гаспадарцы. Прыйшла пара, і згулялі вяселле з каханай дзяўчынай. Яна зараз вучыцца на апошнім курсе педагагічнага ўніверсітэта. І з атрыманнем дыплома Аліна прыйдзе сюды гаспадыняй добраўпарадкаванага дома.

Аляксей з задавальненнем паказвае пакоі, што пахнуць свежымі шпалерамі і фарбай. Ад старой хаты, якую купіла гаспадарка, мала што засталося, хіба толькі сцены, ды і тыя схаваліся за новымі матэрыяламі. Цяпер са з'яўленнем прыбудовы пад кухню і гаспадарчае памяшканне ў доме чатыры жылыя пакоі. У два з іх гаспадары ўжо завезлі новенькую мэблю. Цяпер вядуцца работы ў двары, абсталёўваюцца склеп і хляўчук, як і належыць вясковай сям'і. Рамонт і добраўпарадкаванне праведзены прадпрыемствам, гаспадарам застанецца разбіць клумбы, пасадзіць кветкі, упрыгожыць двор і дом. Нават буслянка побач з хатай засталася ад былых часоў. Значыць, хутка з'явяцца дзеці ў гэтай сям'і — у адзін голас выказваем прапанову-пажаданне гаспадару дома Аляксею, і ён з усмешкай абяцае, што яны з жонкай не будуць зацягваць з нараджэннем новага пакалення. А калі сур'ёзна, то кіроўца Аляксей Масленікаў вельмі задаволены вырашэннем свайго жыллёвага пытання. Новы дом мае статус службовага жылля з магчымым наступным выкупам ва ўласнасць. Гэта вельмі добры варыянт для работніка.



На механізаваным двары гаспадаркі. Сельскагаспадарчая тэхніка ў чаканні новага сезона.





**Так выглядае звычайны вясковы дом у час рэканструкцыі. Пакоі гэтага будынка нічым не адрозніваюцца ад камфартабельнага гарадскога жытла.**

Варта сказаць, што ААТ «Мурава» праводзіць вялікую работу па добраўпарадкаванні населеных пунктаў. Усе нічыйныя трухлявыя дамы зносяцца за кошт гаспадаркі, а вызваленыя землі ўключаюцца ў севазварот альбо выдзяляюцца пад будаўніцтва новага жылля. У гэтым кірунку акцыянернае таварыства цесна супрацоўнічае з сельвыканкамам. Знешні выгляд населеных пунктаў — справа не толькі мясцовай улады, бо і працуе на імідж сельгаспрадпрыемства. Ну які малады спецыяліст захоча жыць у вёсцы, дзе стаяць напаўразваленыя хаты? Таму і клопаты па добраўпарадкаванні тут не аддзяляюць ад вытворчых задач.

### ТЭХНІКА І МЕХАНІЗАЦЫЯ

Вытворчымі задачамі інжынернай службы цяпер з'яўляюцца грунтоўны рамонт, прафілактыка і абслугоўванне тэхнікі. Галоўнага інжынера гаспадаркі Юрыя ЛАШКЕВІЧА застаём у рамонтнай майстэрні.

— Уборка скончана, — расказвае Юрый Міхайлавіч, — з першага лістапада пачалі рамонтны сезон. Ёсць планы-графікі работы, сфарміраваны два звяны — адно будзе займацца рамонтам сельгасмашын без рухавікоў, другое на чале з майстрам-наладчыкам рамантуе машыны з рухавікамі: трактары, камбайны, іншыя механізмы. У нас тэхніка рыхтуецца добра, той жа камбайн фактычна поўнасцю разбіраем, каб правесці не толькі рамонт, але і прафілактыку. Як вынік, падчас сёлетняй уборкі ніводнага дня ніводзін камбайн не прастаяў. Усе намалацілі пад тысячу тон збожжа, а гэта значыць, што кожная з машын працавала без збояў.

Юрый Лашкевіч на сваёй пасадзе 33 гады. Цяпер яго цэх механізацыі складаецца са 120 спецыялістаў і рабочых, якія працуюць у мехатрадзе, аўтагаражах, рамонтнай майстэрні, на машынным двары, у жывёлагадоўлі, электрагаспадарцы і забеспячэнні. Напрыклад, у склад мехатрада ўваходзяць 32 трактары, восем пагрузчыкаў, сем збожжаўборачных камбайнаў і дзве машыны для ўборкі буракоў.

— У асноўным набываем тэхніку айчыннай вытворчасці, — паказвае сваю гаспадарку галоўны інжынер. — Імпартных у нас усяго чатыры адзінкі. Мехатрад укамплектаваны механізатарамі на 100 працэнтаў, сярэдні ўзрост нашага трактарыста — 37 гадоў. Парк пастаянна абнаўляецца. Летась набылі два трактары і шэсць сельгасмашын. Сёлета куплены новы самаходны кармараздатчык, пагрузчык, машына для ўнясення мінеральных угнаенняў, пераабсталяваны раскідвальнік арганікі. Да канца года маем намер купіць яшчэ дзевяціметровую касілку і рулонны прэс-падборшчык.

Аўтапарк гаспадаркі складаецца з 19 грузавых аўтамабіляў і 10 спецыяльных. Вакансій кіроўцаў няма. На прыкладзе сёлетняй уборкі і ранейшых кампаній было відаць, што транспартная галіна свае задачы выконвае якасна. З-за машын не бывае затрымак альбо зрыву графікаў, і гэта вельмі важна, бо падчас пасяўной ці ўборкі кожная рабочая гадзіна мае значэнне, — падкрэслівае Юрый Міхайлавіч.

У рамонтнай майстэрні яе загадчык Віталь БЕРАЗНЮК паказвае цэх зборкі тэхнікі, такарнае і зварачнае аддзяленні, пункт тэхнічнага абслугоўвання тэхнікі, кузню.

Кузні ўжо мала дзе засталіся, а тут не выкідаюць старое абсталяванне, і яно вельмі часта выручае, калі трэба выкаваць дэталь нават да простай прылады. Не даводзіцца недзе замаўляць і плаціць за гэта вялікія грошы. У вольны час кавалі, бывае, робяць, як той казаў, для душы розныя рэчы, якія потым служаць упрыгажэннем у тым ліку двара майстэрні.

Знешняму выгляду машыннага двара і навакольнай тэрыторыі ў «Мураве» ўдзяляюць асаблівую ўвагу. За апошнія гады ён змяніўся да непазнавальнасці, праведзена добраўпарадкаванне, заліта бетонная пляцоўка. Вядзецца пераабсталяванне кацельнай, яна стане больш эканамічная ў сэнсе выкарыстання электраэнергіі і паліва.

### ГІСТОРЫЯ Ў КАРЦІНАХ

Грунтоўны рамонт праведзены на другім паверсе будынка майстэрні. Тут уладкаваны кабінеты для заняткаў, прыведзены ў парадак кабінеты спецыялістаў, абсталяваная зала для сходаў і правядзення вытворчых нарад.

Звяртаем увагу на карціны ў кабінетах. Відаць, што гэта не рэпрадукцыі, а творы мастацтва з аўтографамі мастакоў. І дазнаёмся, што гэта карціны з гісторыяй. Недзе на рубяжы 70-80-х гадоў кіраўніцтва тагачаснага калгаса імя Калініна запрасіла маскоўскіх мастакоў на адмысловы пленэр у гаспадарку. Яны напісалі карціны з калгаснага жыцця, а таксама ўвасобілі сваё бачанне вясковай рэчаіснасці, і гаспадарка выкупіла работы. Вельмі нават нятанна па тых часах. Цяпер большасць з іх захоўваецца ў падсобным памяшканні. Многія маюць надта выразны ўра-патрыятычны змест. Наўрад ці на зажынкі ў поле хадзілі з чырвоным сцягам наперадзе... Але ж гэта аўтарскі погляд цяпер ужо на гісторыю. Тым больш што на палотнах адлюстраваны тутэйшыя людзі. І ў гаспадарцы маюць намер зрабіць нейкі музейны куток. З часам для гэтага адвядуць пакой, дзе можна будзе выставіць карціны. Бо да сваёй гісторыі ў ААТ «Мурава» ставяцца з вялікай пашанай. Нядаўна на відным месцы ўстанавілі мемарыяльную табліцу, у якой адлюстраваны ўсе вехі гаспадаркі. Цяпер кожны ахвотны можа прачытаць, што першы калгас пад назвай «Чырвоная Мурава» арганізавалі тут за два месяцы да вайны. У 1948 годзе ён быў адноўлены. З часам калгас перажыў узбуйненне і атрымаў імя Молатава, а ў 1957-м стаў калгасам імя Калініна. Сваю цяперашнюю назву акцыянернае таварыства атрымала 17 гадоў таму.

### ПРАЦАЎНІКІ І ВЕТЭРАНЫ

— Пашана да гісторыі цесна звязана з пашанай да ветэранаў, якія працавалі раней, — расказвае старшыня прафсаюзнага камітэта Сяргей СЦЯПАНАЎ. — На святы, справаздачна-выбарныя сходы мы заўсёды запрашаем ветэранаў калгаснай вытворчасці, ушаноўваем іх падарункамі, грашовай дапамогай. Для членаў калектыву, які налічвае звыш 230 чалавек, прадугледжаны цэлы шэраг дапамог і выплат, замацаваных калектыўным дагаворам. У нас выгадна доўга працаваць на адным месцы, такія працаўнікі штогод адзначаюцца матэрыяльна. Прафсаюзная арганізацыя клапоціцца пра правядзенне экскурсій, паездак.

Сяргей Сцяпанаў расказаў таксама, што рабочыя і спецыялісты сельгаспрадпрыемства сябруюць са спортам. На ўсіх раённых спаборніцтвах, турыстычных злётах каманда «Муравы» займае прызавыя месцы. А тутэйшым сандружынніцам роўных у раёне наогул знайсці цяжка. Спорту нязменна ўдзяляе ўвагу і дырэктар акцыянернага таварыства Пётр Білецкі. Вечарам усе ахвотныя маюць магчымасць пазаймацца ў спартыўнай зале школы. Напрыклад, Аляксандр Карунас, Віталь Беразнюк — пастаянныя наведвальнікі спартыўнай залы. Маладыя людзі перакананы, што падтрыманне асабістай формы спрыяе паспяховай рабоце на вытворчасці.

**Святлана ЯСКЕВІЧ,**
**Алена ДАЎЖАНОК,**
**фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

УНП 200027222.



*Я прашу цябе, не спяшайся,*
*Азірніся на родны куток.*
*На хвіліначку затрымайся,*
*Мілы дружа, асенні лісток.*

*Мы з табою заўжды былі побач,*
*Ад вясновых шчаслівых мар*
*Не зважалі, як блізіцца роспач*
*Ў шэрай зграі зімовых хмар.*

*Мы з табой у расстанне не верым,*
*Дзён не лічым, не верым снам,*
*Ды нарэшце зімой зразумеем,*
*Як чароўна квітнела вясна.*

## Zамор'е

### У інтэрнэце з'явілася вакансія вандроўніка

**Брытанская арганізацыя Wowcher, якая дапамагае спажыўцам здзяйсняць выгадныя пакупкі, абвясціла аб адкрыцці вакансіі мары — кампанія шукае вандроўніка з гадавым заробкам у 25 тысяч фунтаў стэрлінгаў, паведамляецца на сайце кампаніі.**



Як сказана ў апісанні пасады, у абавязкі супрацоўніка будуць уваходзіць падарожжы па свеце і вядзенне сацыяльных сетак. «Мы проста хочам прадэманстраваць, наколькі ідэальнымі могуць быць прапановы Wowcher Travel», — гаворыцца на сайце кампаніі.

Той, хто атрымае гэтую работу, павінен будзе на працягу 12 месяцаў падарожнічаць па 40 розных напрамках, фатаграфаваць тое, што адбываецца, весці блог аб паездках і ствараць кантэнт у сацыяльных сетках. Акрамя таго, ва ўсе падарожжы супрацоўніку дазваляецца ўзяць аднаго сябра, які можа мяняцца кожную паездку. Адзначаецца, што ўсё, што патрабуецца ад ідэальнага кандыдата, — гэта ўзрост ад 18 гадоў, наяўнасць пашпарта і любоў да падарожжаў.

У якасці заяўкі неабходна апублікаваць 30-секунднае відэа на тэму «Чаму я ідэальны кандыдат для гэтай работы» ў Instagram або Twitter, адзначыць кампанію Wowcher і адзначыць трох сваіх сяброў.

### У Японіі прэзентавалі электронную мятлу

**Японскі аўтавытворца Toyota ў аўтасалоне прадставіў некалькі незвычайных праектаў, аднак больш за ўсё наведвальнікаў аўтасалона здзівіў канцэпт электроннай «лятаючай» мятлы пад назвай e-broom, паведамляе apostrophe.ua.**



Мятла абсталявана электраматорам, і на ёй замацавана кола. Прыстасаванне дастаткова заціснуць паміж ног і пачаць рух. У той жа час, як лётае мятла, прадстаўнікі кампаніі не паказалі. На яе стварэнне вынаходнікаў натхнілі казачныя мётлы ведзьмаў, а таксама лятаючыя прылады герояў знакамітай патэрыяны. Па задумцы аўтараў канцэпт павінен аб'яднаць чалавека і машыну і зноў адкрыць задавальненне ад мабільнасці.

Дзіўна, але першымі захацелі выпрабаваць вынаходніцтва мужчыны на роліках. Само сабой, што электронная мятла зусім не лятае (зрэшты, пакуль што). Але пакатацца на ёй можна. Хутчэй за ўсё прадстаўнікі сусветнай кампаніі вырашылі проста добра пажартаваць і зрабілі гаджэт з удзелам чалавека для шоу і вольнага часу.

### 24 мільёны за шэдэўр на кухні

**Бабулька, на кухні якой шмат гадоў вісела карціна італьянскага мастака XIII стагоддзя, стала міліянеркай пасля таго, як палатно было прададзена на аўкцыёне, паведамляе Associated Press.**

Аўкцыён адбыўся 27 кастрычніка. Карціна была прададзена невядомаму пакупніку каля горада Шанціі (Францыя) за 24 мільёны еўра. Прадстаўнік аўкцыённага дома Acteon Дамінік Ле Каэнт заявіў, што гэты продаж пабіў «сусветны рэкорд для прымітыўнага мастацтва або карцін, створаных да 1500 года».

Былая ўладальніца карціны атрымае большую частку ад выручаных грошай. Паводле слоў Ле Каэнта, эксперты ў галіне мастацтва чакалі, што карціна будзе прададзена за 4—6 мільёнаў. Аднак яны памыліліся, бо творы пэндзля Чымабуэ да гэтага не выстаўлялі на аўкцыёнах, таму ў іх не было статыстычных даных аб кошце яго палотнаў.



Карціна «Абсмейванне Хрыста» пэндзля Чымабуэ памерам 24 на 20 сантыметраў была знойдзена ў чэрвені ў доме пажылой жыхаркі горада Камп'ень на поўначы Францыі. Яна вісела паміж кухняй і сталовай. Аўкцыяніст прапанаваў жанчыне аднесці палатно на ацэнку. Чымабуэ, які вучыў італьянскага майстра Джота, лічыцца прабацькам італьянскага Рэнесансу. Ён парваў з візантыйскім стылем, папулярным у Сярэднія вякі, і пачаў уключаць элементы руху і перспектывы, характэрныя для заходняга жывапісу.

### Бабулька стала бодзібілдарам у 75 гадоў

**Жыхарка Паўднёвай Карэі ў 75 гадоў заняла другое месца на спаборніцтвах бодзібілдараў, піша Лента.ру.**

Лім Чэн-со стала наведваць спартзалу, каб справіцца з болямі, выкліканымі стэнозам пазваночнага канала. «Першы час было так балюча, што я крычала, калі трэніравалася, — сцвярджае яна. — Але я была гатовая на ўсё». Паводле слоў жанчыны, яна разумела, што калі не пацерпіць зараз, потым будзе горш. «Аднойчы трэнер пацікавіўся ў мяне: «Як твая нага?» — расказала Лім. — І ведаеце што? Болю больш не было!»



Пасля гэтага трэнер прапанаваў ёй прыняць удзел у спаборніцтвах бодзібілдараў. Спачатку Лім бянтэжыла тое, што прыйдзецца выступаць у бікіні і на высокіх абцасах, аднак у выніку яна пагадзілася і на адным з конкурсаў заняла другое месца сярод жанчын ад 38 гадоў і старэйшых.

**Іван КУПАРВАС.**

## Спытайце пра радзіннае

# Што рабіць з вянчальнымі атрыбутамі?

**Людміла Мікалаеўна з Рэчыцы Гомельскай вобласці пытаецца: «Мы вянчаліся ў царкве, аднак скасавалі свой шлюб. Пасля разводу засталіся пярсцёнкі, ручнік, на якім стаялі пад вянцом, вянчальныя свечкі, абраз — усё гэта захоўваецца ў мяне дома. Муж ажаніўся з другою. Я не замужам, засталася адна. Што рабіць з абрадавымі рэчамі?»**

Гэта пытанне можна аднесці да разраду аднаго з самых складаных, звязаных з разуменнем сутнасці шырокага кола традыцыйных абрадаў і ролі тых рэчаў, якія аказаліся ў полі абрадавай практыкі і якія станавіліся абрадавымі атрыбутамі і надзяляліся надзвычайным статусам з адпаведнымі сакральна-магічнымі характарыстыкамі. Кожны атрыбут меў свой рытуал пасвячэння, свой час актыўнага выкарыстання (далейшы лёс) і свой варыянт утылізацыі. Да шматлікіх атрыбутаў, якія суправаджалі сямейна-родавыя абрады, стаўленне было асаблівае. Напрыклад, фату або падвянечную сукенку захоўвалі ўсё жыццё. Нават сёння, калі вясельнае адзенне бяруць напракат, а затым вяртаюць назад у салон, фату (той атрыбут, які ўпрыгожваў галаву нявесты і адначасова выконваў засцерагальна-ахоўную ролю) назаўсёды пакідаюць сабе.

Усе атрыбуты, якія так ці інакш на вяселлі былі звязаны з жаніхом і нявестай, надзяляліся статусам недатыкальнасці: нельга садзіцца на месца маладых, нельга для іх класці посуд, якім нехта ўжо карыстаўся, нельга нікому перадаваць фату, непажадана першую шлюбную ноч праводзіць на ложку, засланым чужой бялізнай, нельга, вярнуўшыся з храма, выходзіць з машыны і станавіцца на голую зямлю, нельга маладым, якія ідуць насустрач бацькам, пераходзіць дарогу (успомніце, колькі разоў гэта робяць фота- і відэааператары)...

Тое ж датычыцца і ручніка, на якім былыя муж і жонка некалі стаялі пад вянцом. Ён уваходзіць у лік сакральных і, адпаведна, недатыкальных атрыбутаў вясельнага абраду.

Прыгадаем сітуацыю, сведкамі якой некалькі гадоў таму мы былі самі. Завяршаецца вянчанне ў праваслаўнай царкве ў Ляхавічах. Святар павязаў рукі маладых і павёў да алтара. Ручнік, на якім стаялі жаніх і нявеста, застаўся без нагляду. Мы накіраваліся да свата сказаць яму, каб акуратна згарнуў ручнік і аддаў хросным бацькам маладых. Нам наперарэз кінулася невялікага росту жанчына (потым аказалася, што гэта цётка нявесты), схапіла яго і з пэўнай доляй злосці даволі гучна сказала: «Не лапайце ручнік чужымі рукамі, каб потым нявесту чужыя мужыкі не лапалі!» Такія словы варты дарагога, яны якраз і прыадкрываюць некаторыя таямніцы светапоглядных уяўленняў, пра якія не часта гаварылі ўслых.

Колькі б часу ні прайшло з той пары, але на ручніку засталася энергетыка жаніха і нявесты, замацаваная адпаведным рытуалам паяднання-злучэння-звядзення. Таму аддаць яго ў храм або каму-небудзь іншаму нельга, гэтаксама як нельга і ператварыць яго ў паўсядзённа-бытавую рэч, скажам, звычайны ручнік-уціральнік. Нельга будзе выкарыстаць яго і другі раз нават у тым выпадку, калі яго ўладальніца будзе другі раз выходзіць замуж: за ім ужо замацавана-прамаркіравана пазнака ня-Долі.

Што датычыцца іншых рэчаў, якія аказаліся своеасаблівымі «заложнікамі» далікатнай сітуацыі. Перш за ўсё — вянчальных свечак. Пасля вянчання іх захоўвалі як адзін з моцных абярэгаў ад сурокаў, ад бяздзетнасці. У выпадку скасавання шлюбу свечкі лепш за ўсё запаліць у той дзень года, калі было вянчанне, і дачакацца, пакуль яны згараць цалкам. Рэшткі воску можна аднесці ў храм і пакласці ў скрынку, дзе складваюць агаркі святочных свечак.

Што датычыцца заручальных пярсцёнкаў, то з іх неабходна зняць памяць аб колішніх уладарах. Вазьміце грамнічную свечку, запаліце і некалькі хвілін патрымайце пярсцёнкі над яе полымем. Агонь, як і вада, здольны нейтралізаваць інфармацыю аб мінулым. Пасля гэтага пакладзіце іх у шкатулку і захавайце як знак вашай сямейнай гісторыі. Але прытым трэба памятаць: гэтыя заручальныя пярсцёнкі не выкарыстоўвалі ў абрадавай практыцы іншых пакаленняў (пераплавіць і зрабіць новыя пярсцёнкі для будучых маладажонаў), з іх непажадана выраблячь нейкія іншыя ўпрыгожанні.

Такім чынам, рытуальнае выкарыстанне атрыбута ў значнай ступені абумоўлена яго ўласнымі функцыянальнымі асаблівасцямі, якія ў побытавым ужыванні маюць іншую, уласна практычную накіраванасць.

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

*Дасылайце свае пытанні пра карані і прыстасаванасць да сучаснага жыцця каляндарных і сямейна-побытавых народных традыцый і абрадаў на паштовы або электронны адрас рэдакцыі з пазнакай «Пра радзіннае».*

## Снарады ў... старым надмагіллі

**З могілак па вуліцы Перамогі ў Гродне сапёрамі былі вывезены тры 76-міліметровыя снарады часоў Вялікай Айчыннай вайны.**

Як паведамляе аддзяленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС аблвыканкама, іх выявіў у... бетонным надмагіллі работнік, які дэманціраваў канструкцыю. Боепрыпасы ў літаральным сэнсе аказаліся аблітыя бетонам і знаходзіліся ў нездавальняючым стане (прысутнічалі ачагі карозіі, некаторыя месцы згнілі). Небяспечная знаходка была перамешчаная спецыялістамі на палігон, дзе яе знішчылі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

# ЯК ПАЗБАВІЦЦА АД МЫШЭЙ

**Наўрад ці знойдзецца чалавек, які ні разу ў жыцці не сутыкаўся з «мышынай» праблемай. Пастка — ужо мінулае стагоддзе, і эфектыўным гэты сродак можна назваць, калі гаворка ідзе хіба што пра адну-дзвюх мышак. А што рабіць, калі ў доме завёўся цэлы выводак нежаданых «суседзяў»?**



### УЛЬТРАГУКАВЫ АДПУДЖВАЛЬНІК МЫШЭЙ І ПАЦУКОЎ

Мабыць, самы гуманны сродак ад пацукоў і мышэй — спецыяльны прыбор, які выпраменьвае ўльтрагукавыя хвалі, што дзейнічаюць на нервы грызунам.

Электронны адпуджвальнік мышэй і пацукоў — гэта вельмі зручна. Вам не трэба шукаць па закутках дома нежывыя целы грызуноў або рэгулярна правяраць, ці не папаўся хто ў пастку. Вы проста ўключаеце прыбор у сетку і забываецеся пра яго (і пра мышэй таксама).

Ультрагукавыя хвалі распаўсюджваюцца па памяшканні, адбіваючыся ад цвёрдых паверхняў. Мяккія матэрыялы паглынаюць хвалі, таму для большай эфектыўнасці змясціце прыбор у максімальна пустым пакоі.

Для людзей і хатніх жывёл ультрагукавыя адпуджвальнікі бяспечныя, але вядомыя выпадкі, калі пры выкарыстанні падобных прыбораў ультрагук дзейнічаў на сабак.

### КЛЕЙ ДЛЯ ЛОЎЛІ МЫШЭЙ

Калі вы не заўзяты абаронца флоры і фаўны, звярніце ўвагу на гэты сродак. Каб зрабіць клеевую пастку, купіце адмысловы клей ад мышэй, уважліва прачытайце інструкцыю, нанясіце прэпарат на пэўную паверхню (напрыклад, накрыўку ад кардоннай скрынкі) і пастаўце прыладу ў «месцы навалы мышэй». Праз некаторы час вы выявіце бездапаможнага звярка, намёртва прыліплага да паверхні, на якую быў нанесены клей.

Майце на ўвазе, што калі ў вас ёсць хатнія гадаванцы, яны таксама рызыкуюць трапіць у пастку. Таму паклапаціцеся пра тое, каб абмежаваць іх доступ у памяшканне, дзе яна ўсталяваная.

### АТРУТА ДЛЯ ПАЦУКОЎ І МЫШЭЙ

Існуе мноства розных ядахімікатаў, з дапамогай якіх можна хутка пазбавіцца ад мышэй на гарышчы і ў доме. Іх выпускаюць у выглядзе спрэяў, геляў, парашкоў, вадкасцяў і гатовых спрэсаваных прынад. У залежнасці ад таго, якім чынам прэпарат уздзейнічае на арганізм грызуна, атруты дзеляцца на тыя, якія пашкоджваюць:

- ✓ органы стрававання;
- ✓ крывяносную сістэму;
- ✓ органы дыхання;
- ✓ касцявыя тканкі (прэпараты на аснове белага і жоўтага фосфару);
- ✓ нервовую сістэму (мыш'як).

Таксама ёсць сродкі, што дазваляюць пазбавіцца ад паху мышэй. Іх дзеянне накіравана на муміфікацыю трупаў грызуноў і прадухіленне раскладання (напрыклад, прынады Інта-Вір). Выконвайце меры засцярогі і ўважліва чытайце інструкцыю па ўжыванні ядахімікатаў.

### НАРОДНЫЯ СРОДКІ

Народныя сродкі ад мышэй у доме добрыя тым, што не таксічныя. Мышы-палёўкі на дачы і звычайныя пацукі ў гарадскіх кватэрах не пераносяць адных і тых жа рэчаў. Якога ж паху баяцца мышы?

На першым месцы — перачная мята. Намачыце алеем гэтай расліны кавалачкі ваты і раскладзіце па кутах хаты. Мышам не спадабаецца гэты водар, і яны пойдуць шукаць шчасця ў іншае месца.

Яшчэ адзін пах, які адпужвае мышэй, — цыбуля. Разрэжце цыбуліну і пакладзіце ў месцы, дзе жывуць мышы. Не забывайце мяняць цыбуліну, каб пах заставаўся свежым.

Нельга таксама не згадаць іншыя расліны, якія адпуджваюць грызуноў. У месцах захоўвання ўраджаю раскладзіце лісце і сцеблы піжмы, палыну, багуна балотнага, рамонкі, бузіны.

Калі працягваць тэму «чаго баяцца мышы», то скажам так: мышы баяцца парадку. Так-так, навядзіце парадак у доме: пазбаўцеся ад старога хламу, заладзьце шчыліны ў сценах і падлозе, праверце, ці правільна захоўваюцца прадукты на кухні, ці герметычна запакаваныя крупы.

## Даты. Падзеі. Людзі

**13 ЛІСТАПАДА**

У краіне

**1806** год — нарадзілася Эмілія Плятэр, беларуская фалькларыстка, удзельніца паўстання 1830—1831 гадоў. Збірала і апрацоўвала беларускія народныя песні, пісала вершы. У 1831 годзе ўзначаліла паўстанне ў мястэчку Дусетас (Літва), арганізавала партызанскі атрад, які пасля шматлікіх баёў уліўся ў рэгулярнае польскае войска. Была ўключана ў яго штаб, прызначана ганаровым камандзірам роты і атрымала званне капітана. Памерла ад ран у 1831 годзе. Пра яе напісаны вершы паэтамі розных краін Еўропы, у тым ліку Адамам Міцкевічам. Імя Эміліі Плятэр насіў асобны жаночы батальён Першай пяхотнай дывізіі імя Тадэвуша Касцюшкі Войска Польскага, сфарміраванай у 1943 годзе ў СССР для барацьбы з нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

**1882** год — нарадзіўся Дзмітрый Сільвч Чарнушэвіч, дзяржаўны дзеяч Беларусі. З 1918 года працаваў у Беларускім нацыянальным камісарыяце і беларускай секцыі РКП(б). У студзені—лютым 1919 года — член Часовага рабоча-сялянскага савецкага ўрада Беларусі, камісар сацыяльнага забеспячэння. З сакавіка 1924 года — наркам унутраных спраў БССР, затым — сакратар ЦВК БССР. З 1927 года — старшыня Упраўлення дзяржаўнага страхавання БССР. У 1938 годзе рэпрэсаваны. Рэабілітаваны ў 1958 годзе.

**1923** год — нарадзіўся (г. Мінск) Раман Цімафеевіч Ахрамовіч, савецкі вучоны, усходазнавец. У 1962—1975 гадах — намеснік дырэктара ў Інстытуце ўсходазнаўства АН СССР, адначасова выкладаў у Інстытуце міжнародных адносін пры Міністэрстве замежных спраў СССР і Інстытуце ўсходніх моў пры МДУ. З 1975 года працаваў дырэктарам Інстытута краін Азіі і Афрыкі пры МДУ. З'яўляўся членам секцыі гістарычных навук Камітэта па Ленінскіх і Дзяржаўных прэміях СССР, быў членам прэзідыума Савецкага камітэта салідарнасці краін Азіі і Афрыкі. Аўтар каля 70 навуковых прац па праблемах нацыянальна-вызваленчага руху і міжнародных адносін на Усходзе. Памёр у 1989 годзе.

У свеце

**1819** год — у Санкт-Пецярбургу ўрачыста адкрыты ўніверсітэт, заснаваны ў лютым на базе Галоўнага педагагічнага інстытута.

**1909** год — нарадзіўся Віталь Дзмітрыевіч Даронін, расійскі акцёр тэатра і кіно, народны артыст РСФСР. Здымаўся ў фільмах «Клопатная гаспадарка», «Вяселле з пасагам», «Людзі і звяры», «Палата». Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1951). Памёр у 1976 годзе.

**1914** год — нарадзіўся Уільям Гібсан, амерыканскі драматург, аўтар рамана-бестселера «Павуцінне», п'ес «Двое на арэлях» і «Стваральніца цуду», якія прынеслі яму сусветную славу. Памёр у 2008 годзе.

**1918** год — пастановай УЦВК анулюваны Брэсцкі мірны дагавор у сувязі з паражэннем Германіі ў сусветнай вайне.

**1978** год — выдадзены загад Спорткамітэта СССР «Аб развіцці барацьбы каратэ». Годам пазней Усесаюзная секцыя каратэ была пераўтворана ва Усесаюзную федэрацыю каратэ, якую ўзначаліў намеснік старшыні Цэнтральнага Савета «Дынама» палкоўнік дзяржбяспекі Віктар Купрыянаў.



**1979** год — у Жэневе прадстаўнікамі 35 краін прынята Канвенцыя аб трансгранічным забруджванні паветра на вялікія адлегласці. Уступіла ў сілу ў сакавіку 1983 года.

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | — 8.32 | 17.15 | 8.43 |
| Віцебск | — 8.27 | 16.59 | 8.32 |
| Магілёў | — 8.22 | 17.05 | 8.43 |
| Гомель | — 8.13 | 17.07 | 8.54 |
| Гродна | — 8.46 | 17.31 | 8.45 |
| Брэст | — 8.41 | 17.37 | 8.56 |

### Месяц

*Поўня 12 лістапада.*
*Месяц у сузор'і Авена.*

### Імяніны

***Пр.** Аляксандра, Аляксея, Анатоля, Івана, Сяргея, Усевалада, Якава.*
***К.** Валянціны, Хрысціны, Мікалая.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**Мілая, ты не тоўстая, ты проста падрыхтаваная да зімы.**

— Як чароўна ад цябе пахне! Гэты пах прымушае страціць розум, абуджае жывёльныя інстынкты. Што гэта за парфума?

— Гэта ў мяне чабурэк у дэкальтэ праваліўся.

**Як я ўжо казаў, я не люблю паўтарацца.**

Адэскі панадворак.

— Роза Маркаўна, вы такі з трэцяга дня не сварыцеся з мужам?..

— Ды... мы пасварыліся!




caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гомелі: 28 27 27, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 3878.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 12 лістапада 2019 года.